НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
ДНУ «ІНСТЫТУТ МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАГРАФІІ І ФАЛЬКЛОРУ
ІМЯ КАНДРАТА КРАПІВЫ»

УДК 392.3 (476-21) (091) «19/20» (043.3)

**КАЛАЧОВА Ірына Іванаўна**

# ЭТНАКУЛЬТУРНЫЯ ПРАЦЭСЫ Ў ГАРАДСКОЙ СЯМ’І БЕЛАРУСАЎ У АПОШНЯЙ ТРЭЦІ XX – ПАЧАТКУ XXI СТ.

Аўтарэферат
дысертацыі на суісканне вучонай ступені
доктара гістарычных навук

па спецыяльнасці 07.00.07 – этнаграфія, этналогія, антрапалогія

Мінск, 2009

Работа выканана ў ДНУ «Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы» Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі

Навуковы кансультант – **А. І. Лакотка,**
доктар гістарычных навук, доктар архітэктуры,
прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі,
дырэктар ДНУ «ІМЭФ імя Кандрата Крапівы» НАН Беларусі

Афіцыйныя апаненты: **А.В. Гурко,**
доктар гістарычных навук, дацэнт, вучоны сакратар ДНУ «ІМЭФ імя Кандрата Крапівы» НАН Беларусі;

**І. П. Корзун,**
доктар гістарычных навук, прафесар
«Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт»;

**Л.П. Шахоцька,**
доктар сацыялагічных навук, прафесар, галоўны
навуковы супрацоўнік ДНУ
«Інстытут эканомікі» НАН Беларусі

Апаніруючая арганізацыя – УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»

Абарона адбудзецца 23 снежня 2009 г. у 11 гадзін на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 01.42.01 у ДНУ «Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы» Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па адрасе: 220072, г. Мінск, вул. Сурганава, 1, корп. 2, ауд. № 302; secr@bas-net.by; тэл. вучонага сакратара (017) 284-29-24.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы ДНУ «Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы» Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (220072, г. Мінск, вул. Сурганава, 1, корп. 2).

Аўтарэферат разасланы «20» лістапада 2009 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый,
доктар гістарычных навук Г. І. Каспяровіч

© Калачова І. І., 2009
© БНТУ, 2009

# УВОДЗІНЫ

Гарманічнае функцыянаванне сям'і як значнага сацыяльнага і этнакультурнага інстытута на сучасным этапе знаходзіцца ў цэнтры ўвагі беларускага грамадства. І гэта не выпадкова: сям'я – асноўная крыніца ўзнаўлення нацыі, захавальнік багатых традыцый міжпакаленных стасункаў беларусаў, сістэмы роднасці і адносін паміж блізкімі, транслятар нацыянальнай спадчыны і адвечных духоўных каштоўнасцей. Маральныя асновы сям'і і яе матэрыяльнае становішча, мікраклімат у ёй, яе дабрабыт, духоўныя ідэалы аказваюць дзейсны ўплыў на сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё краіны, фарміруюць аснову стабільнасці ў будучым.

Сям'я, дзеці, сямейныя традыцыі, захаванне пераемнай сувязі паміж пакаленнямі – прыярытэтныя кірункі дзяржаўнай сацыяльнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь. Галоўны з іх у адносінах да сям'і – ствараць умовы для гарманічнага яе развіцця, спрыяць трываламу ўмацаванню і раскрыццю яе патэнцыялу. Таму даследаванне праблем сям'і як ячэйкі грамадства, як асновы беларускага этнасу ўяўляецца актуальным і значным.

Даследаванне сям'яў беларусаў, вывучэнне этнакультурных працэсаў, што адбываюцца ў ёй, з'яўляецца актуальнай задачай беларускай этналогіі. Неабходнасць вывучэння праблемы ў даследуемы перыяд – апошняй трэці ХХ – пачатку ХХІ ст. – абумоўлена значнымі сацыяльна-палітычнымі і эканамічнымі трансфармацыямі, якія адбыліся ў гэты час у грамадскім развіцці і аказалі ўплыў на сям'ю – найважнейшую крыніцу фарміравання, захоўвання і трансляцыі традыцый выхавання і сацыялізацыі дзяцей. Асабліва небяспечнай з'яўляецца страта маладымі пакаленнямі каштоўнасных арыенціраў, якія ўтрымліваюцца ў нацыянальнай культуры беларускага народа, што ўжо сёння пагражае нестабільнасцю ў дэмаграфічнай сітуацыі, скарачэннем нараджальнасці, аслабленнем міжпакаленных сувязей. Вывучэнне гэтых новых тэндэнцый, відавочна, з'яўляецца важным для распрацоўкі асноў сямейнай палітыкі дзяржавы, работы з моладдзю і маладымі сем'ямі.

Значнасць праблемы заключаецца і ў зменах, якія адбыліся і працягваюць адбывацца ва ўкладзе жыцця сям'і, – сёння большасць сямей беларусаў пражываюць у гарадскім полікультурным асяроддзі, якое шырока прадстаўлена людзьмі, адрознымі па веравызнанні, ментальнасці і прыналежнасці да той ці іншай культурнай супольнасці. Ва ўмовах такой полікультурнасці бясспрэчна пазітыўным бачыцца працэс узаемаўзбагачэння традыцый пры беражлівым захаванні нацыянальнай самабытнасці.

Функцыянаванне этнакультурных працэсаў у гарадской сям'і беларусаў у апошняй трэці ХХ – пачатку ХХІ ст. не з'яўлялася аб'ектам спецыяльнага комплекснага даследавання ў беларускай этналогіі. Між тым, вывучэнне тэндэнцый у працяканні этнакультурных працэсаў, механізма рэпрадукцыі этнакультурных працэсаў, даследаванне грамадскіх і сямейных традыцый, традыцый роднасна-сваяцкіх адносін, выхавання і этыкету садзейнічае больш глыбокаму пазнанню нацыянальнай культуры беларускага народа маладымі пакаленнямі, спрыяе фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці, захаванню

нацыянальнай самабытнасці, з'яўляецца адным з прыярытэтаў стабільнай сацыяльнай палітыкі ў краіне.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

### Сувязь тэмы з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі

Тэматыка дысертацыі распрацоўвалася ў рамках дзяржаўных фундаментальных даследаванняў: «Гісторыя беларускай нацыі, дзяржаўнасці і культуры» на 2006–2010 гады («Гісторыя і культура»), заданне 16 «Традыцыі народнай культуры этнічных супольнасцей Беларусі: гісторыя, сучаснае становішча і перспектывы развіцця», нумар дзяржаўнай рэгістрацыі – 20061103;

Даручэння п. 14 Прэзідэнцкай праграмы «Дзеці Беларусі», заданне «Распрацоўка і ажыццяўленне комплексу мерапрыемстваў па адраджэнні народнай педагогікі»;

Рэспубліканскай праграмы «Моладзь Беларусі» (2006–2010 гг.), заданне «Маладая сям'я ў сучасным грамадстве: дынаміка; падрыхтоўка да сямейнага жыцця; сацыяльна-педагагічнае суправаджэнне» (навуковы кіраўнік – канд. гіст. навук І. І. Калачова), нумар дзяржаўнай рэгістрацыі – 20072238.

Тэма дысертацыі адпавядае прыярытэтнаму напрамку фундаментальных навуковых даследаванняў, прысвечаных гісторыі культуры Беларусі, актуальным праблемам яе сучаснага становішча і перспектывам развіцця.

### Мэты і задачы даследавання

*Мэта дысертацыйнага даследавання* – раскрыццё асноўных тэндэнцый дынамікі этнакультурных працэсаў у гарадской сям'і беларусаў у апошняй трэці XX – пачатку XXI ст.

*Задачы даследавання:*

1) распрацаваць тэарэтыка-метадалагічныя падыходы да даследавання дынамікі этнакультурных працэсаў у гарадской сям'і беларусаў у апошняй трэці XX – пачатку XXI ст.;

2) вылучыць асноўныя перыяды дынамікі этнакультурных працэсаў у гарадской сям'і беларусаў у апошняй трэці XX – пачатку XXI ст.;

3) ахарактарызаваць стан і тэндэнцыі працякання этнакультурных працэсаў у гарадской сям'і і шлюбе беларусаў; заканамернасці структурна-функцыянальных і тыпалагічных змяненняў у сям'і;

4) выявіць крыніцы і сістэму трансляцыі этнічных ведаў, якая сфарміравалася ў гарадской сям'і беларусаў (на прыкладзе засвойвання традыцыйнай каляндарнай абраднасці), даць характарыстыку сем'ям, якія з'яўляюцца носьбітамі і пераемнікамі этнічных ведаў;

5) прасачыць традыцыі і інавацыі ў этнакультурным комплексе сямейна-бытавых абрадаў (вясельных, радзінных, абрадаў ушанавання продкаў);

6) вылучыць змяненні ў сістэме роднасна-сваяцкіх і бацькоўска-дзіцячых адносін; у сістэме перадачы традыцый выхавання і этыкету;

7) вызначыць шляхі рэалізацыі сацыяльна-педагагічнага і выхаваўчага патэнцыялу нацыянальных традыцый у адукацыйнай і сацыякультурнай сферы і паказаць іх уплыў на этнакультурную сітуацыю ў гарадской сям’і;

8) распрацаваць напрамкі работы з моладдзю па фарміраванні адносін да сям’і, заснаваных на ўсведамленні яе каштоўнасці (на прыкладзе вышэйшай школы).

**Аб’ект і прадмет даследавання**

*Аб’ектам дысертацыйнага даследавання* з’яўляецца гарадская сям’я беларусаў ва ўмовах трансфармацый этнакультурных працэсаў у 70-я гады XX – пачатку XXI ст.

*Прадмет даследавання* – дынаміка этнакультурных працэсаў у гарадской сям’і беларусаў у апошняй трэці XX – пачатку XXI ст.

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону**

1. Працяканне этнакультурных працэсаў у гарадской сям’і беларусаў і іх асаблівасці ў розныя гістарычныя перыяды характарызуюцца неаднароднасцю, шматвектарнасцю і супярэчлівасцямі. У дадзеным даследаванні дынаміка этнакультурных працэсаў разгледжана па перыядах, вылучаных у выніку вывучэння тэмы: першы – 70–80-я гады XX ст.; другі – 80–90-я гады XX ст.; трэці – 1991 г. – пачатак XXI ст.

За аснову тэарэтычнай канцэпцыі даследавання этнакультурных працэсаў у сям’і ўзяты вядучыя палажэнні *тэорыі эвалюцыі* (аб сям’і як носьбіце пераемнасці традыцый, што забяспечвае механізм пазітыўных трансфармацый; аб важнейшых функцыях сям’і – узнаўленні і сацыялізацыі; аб вызначэнні яе супярэчлівай ролі ў грамадстве: з аднаго боку, – сям’я змяняецца пад уплывам грамадскіх працэсаў (у гэтым сэнсе яна пасіўная адзінка сацыяльных перамен); з другога – сама актыўна ўплывае на грамадскае развіццё (актыўная адзінка); *тэорыі мадэрнізацыі* (аб мадэрнізацыі як працэсе трансфармацый, ядром якой з’яўляецца перабудова ўсіх грамадскіх працэсаў і інстытутаў; аб уплыве на асобу чалавека, яго ўнутраны свет; аб сям’і як аснове сацыялізацыі ў традыцыйных грамадствах і захаванні і прымнажэнні гэтай ролі ў сучаснасці); *тэорыі каштоўнасцей* (аб тым, што каштоўнасці традыцыйнай культуры па-ранейшаму з’яўляюцца стрыжнем фарміравання асобы і крыніцай развіцця чалавека, а сям’я – спрыяльным асяроддзем сацыялізацыі і выхавання; і *тэорыі полікультурнасці* (аб уздзеянні этнічнай неаднароднасці гарадскога асяроддзя на ўклад жыцця сям’і; аб фарміраванні талерантных адносін да культурнай разнастайнасці гарадской прасторы пры беражлівым захаванні нацыянальнай самабытнасці і традыцый; аб уплыве полікультурнага асяроддзя горада на аднароднасць шлюбаў і тып сямейных структур).

Сінтэз вядучых палажэнняў дадзеных тэорый дае магчымасць выявіць найбольш значныя адметнасці этнакультурных працэсаў, да якіх у першую чаргу трэба аднесці ўзаемаўплыў традыцыі і інавацыі. У сучасных умовах фарміравання свядомасці асобы пры істотным уздзеянні шматлікіх інфармацыйных крыніц

традыцыя як стабільная сістэма існавання сям'і і выток фарміравання нацыянальных каштоўнасцей не страчвае дзейснага ўплыву на асобу, застаецца прыярытэтнай і толькі набывае новыя рысы, якія сведчаць пра станоўчую дынаміку ў развіцці сям'і.

На сучасным этапе рэпрадуктаванне этнакультурных працэсаў у гарадской сям'і адбываецца ў сітуацыі суіснавання традыцый і інавацый, захаванасці каштоўнасцей калектывізму і пранікненні каштоўнасцей новага тыпу – індывідуалізму, эгацэнтрызму і інш. Наяўнасць гэтых з'яў – своеасаблівая рыса пераходу да новага этапа ў функцыянаванні этнакультурных працэсаў у сям'і.

Даследаванне характару названых працэсаў у сям'і беларусаў дазволіла выявіць пазітыўныя тэндэнцыі ў захаванні традыцый, што ўказвае на дастаткова моцную ўкаранёнасць нацыянальнай культуры ў быт сям'і.

2. Упершыню даследаванне этнакультурных працэсаў у апошняй трэці XX – пачатку XXI ст. дазволіла вылучыць асноўныя перыяды дынамікі этнакультурных працэсаў і даць ім характарыстыку.

У 70–80-я гады XX ст. прыярытэтнымі былі каштоўнасці савецкай сістэмы ў функцыянаванні сям'і, бытаванне нацыянальных традыцый і абрадаў беларусаў не выходзіла за межы ўнутрысямейнага і міжсямейнага ўзроўняў, а сямейна-шлюбныя адносіны, структура сям'і, яе функцыі і тыпалогія падпарадкоўваліся нарматыўным прынцыпам, якія сфарміраваліся пад уплывам грамадскіх працэсаў.

Для 80–90-х гадоў XX ст. характэрны аслабленне ўздзеяння каштоўнасцей савецкай сістэмы на сям'ю і абуджэнне нацыянальнай самасвядомасці, адраджэнне нацыянальнай сістэмы каштоўнасцей і цікавасць да матэрыяльнай, духоўнай і сацыяльнай культуры беларускага народа, што было звязана перш за ўсё з набыццём Рэспублікай Беларусь дзяржаўнага суверэнітэту.

У перыяд з 1991 г. да пачатку XXI ст. умацоўваецца роля нацыянальных традыцый у функцыянаванні сям'і, павялічваецца іх значэнне ў грамадскім і сацыяльна-культурным жыцці. Тыповымі прыметамі этнакультурных працэсаў у сям'і гараджан становяцца новыя з'явы ў шлюбна-сямейных адносінах, суіснаванне традыцый і інавацый у сямейна-бытавой абраднасці, звяртанне да хрысціянскіх абрадаў, адраджэнне цікавасці да фальклорна-этнаграфічнай спадчыны, беларускай мовы, да архітэктурных помнікаў нацыянальнай культуры. Узрастае каштоўнасць шлюбу як трывалай формы сямейных адносін і бацькоўства як важнейшай асновы сям'і і грамадства.

3. Прыналежнасць большасці беларусаў да гарадскога насельніцтва спрыяе фарміраванню пэўных адметнасцей ва ўкладзе жыцця, які характарызуецца, з аднаго боку, захаванасцю рыс традыцыйнасці, з другога – з'яўленнем новых прымет, якія найбольш выразна выяўляюцца ў культуры побыту, адносінах паміж людзьмі, святах. У аснове заключэння шлюбу і стварэння сям'і сучасных беларусаў па-ранейшаму ляжаць самыя значныя маральныя ідэалы беларускага народа: любоў, каханне, павага да бацькоў, каштоўнасць сям'і і нараджэння дзяцей. У радзіннай абраднасці захоўваюцца рысы традыцыйнага беларускага абраду, якія праяўляюцца ў выкананні абраду хрышчэння дзіцяці, святкаванні хрэсьбін і інш. Урачыстая рэгістрацыя шлюбу ў органах ЗАГС, ва ўстановах сацыякультурнай

сферы практычна заўсёды адбываецца з выкарыстаннем элементаў традыцыйнай вясельнай абраднасці беларусаў. Можна канстатаваць, што ў канцы 90-х гадоў ХХ – пачатку ХХІ ст. сямейна-бытавая абраднасць гарадской сям'і пастулова набыла акрэсленыя і выразныя рысы мадэрнізаванай нацыянальнай традыцыі.

Практычна адбываецца станаўленне абноўленай сістэмы сямейных адносін, у якой пэўнае месца займаюць такія формы сям'і і шлюбна-сямейных адносін, як шлюбы-сужыцці, сем'і з абмежаваннем бацькоўскіх роляў, сем'і з алкагольна залежнымі бацькамі і інш. Аднак выяўленыя трансфармацыі не закранаюць базавых прынцыпаў сямейна-шлюбных адносін, а стварэнне сучаснай сістэмы прававой абароны сям'і забяспечвае яе гарманічную жыццядзейнасць.

Характар этнакультурных працэсаў і іх інтэнсіўнасць наўпрост залежаць ад змен. У апошняй трэці ХХ – пачатку ХХІ ст. у структуры сям'і, яе складзе, функцыях і тыпах зафіксаваны такія змены, як нуклеарызацыя, аўтамізацыя і індывідуалізацыя сям'і, нівеліраванне традыцыйных этычных норм і стэрэатыпаў, распаўсюджанасць і ўмацаванне функцый аховы, бяспекі, апекі, партнёрства і супрацоўніцтва, функцыі наследавання і аслабленне рэпрадуктыўнай, экзістэнцыяльнай функцый і функцыі сацыялізацыі. Прычым неабходна адзначыць, што на змену характэрнаму для 90-х гадоў аслабленню рэпрадуктыўнай функцыі ў пачатку ХХІ ст. прыйшлі яе стабілізацыя, а пасля і ўзмацненне.

4. Пераемнасць традыцый з'яўляецца важнейшай характарыстыкай этнакультурных працэсаў у сям'і. Асабліва моцна яна выяўляецца ў адносінах сям'і да каляндарных традыцый, як складніка нацыянальнай культуры беларускага народа.

Аналіз механізма трансляцыі этнічных ведаў у другой палове ХХ ст. паказвае, што гэты працэс ажыццяўляўся ў межах жывога дыялогу паміж пакаленнямі – старэйшымі і малодшымі, праз калектыўнае і індывідуальнае засвойванне спадчыны. Носьбіты і пераемнікі інфармацыі ўяўлялі з сябе гарманічную дыяду, у рамках якой адбываўся жыватворны камунікатыўны працэс, насычаны эмацыянальнымі пачуццямі і ўяўленнямі. На сучасным этапе, у пачатку ХХІ ст., носьбітамі першага круга трансляцыі этнакультурнай інфармацыі вызначаны бацькі. Яны, а не дзяды і бабулі з'яўляюцца найбольш рэферэнтнай групай носьбітаў. Гэта ўказвае на небяспечнае скарачэнне колькасці членаў сям'і і аслабленне сувязей паміж пакаленнямі. Істотнае значэнне ў атрыманні ведаў належыць сучасным інфармацыйным сродкам, якія з'яўляюцца каналам хуткай камунікацыйнай сувязі.

Роля каляндарных звычаяў і абрадаў у сям'і як сродку далучанасці да калектыўных каштоўнасцей традыцыйнай спадчыны з'яўляецца дастаткова высокай. Гэта ўказвае на моцную іх ўкаранёнасць у побыт гараджан. Разам з тым выяўлена тэндэнцыя змены крыніц у перадачы ведаў – сям'я губляе функцыю транслятара і перадае яе не больш этнічна моцным пакаленням – бабулям, дзядулям, а слабейшым – бацькам.

5. Цэласнасць этнакультурнага комплексу сямейна-бытавых абрадаў беларусаў у гарадах абумоўлена ўзроўнем адаптаванасці нацыянальных традыцый да шматнацыянальнага гарадскога асяроддзя.

Найбольш захаванымі традыцыйнымі абрадамі ў пачатку XXI ст. з'яўляюцца радзінны абрад і абрад ушанавання продкаў, у той час як вясельны абрад пастаянна дапаўняецца новымі элементамі.

У параўнанні з перыядам 70-80-х гг. XX ст. і 80-90-мі гг. XX ст. на сучасным этапе распаўсюджванне атрымала вянчанне ў храме, уключэнне ў вяселле лакальных этнаграфічных матэрыялаў і адначасова, сучаснага музычна-паэтычнага суправаджэння. Для радзіннага абрада характэрны наступныя рысы: сумяшчэнне рэгістрацыі дзяцей у ЗАГСах з хрышчэннем у царкве, наяўнасць хросных бацькоў, для абрадаў ушанавання продкаў – адраджэнне царкоўнага абраду, устанаўленне свят Радаўніцы, Дзядоў на дзяржаўным узроўні.

Нацыянальныя сямейна-бытавыя традыцыі бытуюць у гарадах усіх тыпаў: у Мінску, буйных, сярэдніх і малых гарадах. Аднак выяўленыя асаблівасці бытавання традыцый указваюць на захаванне лакальных адметнасцей у малых і сярэдніх гарадах.

Даследаванне этнакультурнага комплексу беларусаў – вясельных, радзінных абрадаў, абрадаў ушанавання продкаў – дазваляе сфармуляваць вывад аб высокай значнасці і каштоўнасці традыцый для функцыянавання і развіцця сям'і і грамадства ў цэлым.

6. У міжпакаленных, роднасна-сваяцкіх і бацькоўска-дзіцячых адносінах адбываецца фарміраванне новых з'яў. Характэрнымі адметнасцямі сучаснага этапа з'яўляюцца працэсы ўнутрысямейнай дэмакратызацыі, заснаванай на прынцыпах узаемапаважлівых, раўнацэнных адносін супрацоўніцтва, даверу, партнёрства, клопату і добразычлівасці. Сям'я стала больш гнуткай, чулліва рэагуе на змены, якія адбываюцца, і, убіраючы ў сябе новае, захоўвае пры гэтым свае традыцыйныя, першапачатковыя ўстоі. Разам з тым, у роднасна-сваяцкіх адносінах сустракаюцца і такія негатыўныя адметнасці, як зніжэнне ўзроўню ўзаемнай сваяцкай падтрымкі і дапамогі, аслабленне традыцыйных этычных норм у паводзінах.

Гэтыя працэсы закранаюць і бацькоўска-дзіцячыя адносіны. Крытэрыем, які дае магчымасць адзначыць тэндэнцыю, з'яўляюцца функцыянаванне ў сям'і традыцый матэрыяльнай і маральнай падтрымкі і дапамогі, становішча выхаваўчай дзейнасці сям'і. Захоўваюцца мадэлі міжпакаленнай трансмісіі: традыцыі матэрыяльнай падтрымкі і дапамогі бацькамі дзяцей і маральнай – дзецьмі бацькоў застаюцца важнейшым сродкам аб'яднання сям'і, узаемнага клопату, праяўленнем любві і павагі. Заўважана наступная тэндэнцыя: змяншаецца значнасць жыццёвага прыкладу бацькоў для пераймання і паўтарэння дзецьмі, у свядомасці маладых пакаленняў фарміруецца імкненне да самастойнасці і незалежнасці ў паводзінах і выбары мадэлей жыцця.

Ступень захаванасці міжпакаленных адносін аказвае ўплыў на выхаваўчыя здольнасці бацькоў. Сучаснаму інстытуту бацькоўства ўласцівы такія асаблівасці, як павышэнне ўзроўню адказнасці бацькоў за нараджэнне і выхаванне дзяцей, іх адукацыю і фарміраванне актыўнай грамадзянскай пазіцыі. І нават калі бацькі не ў

поўнай меры валодаюць неабходнымі педагагічнымі ведамі, працэс выхавання абавязкова дае плён пры ўмове выкарыстання традыцыйных прыёмаў народнай педагогікі і ажыццяўленні яго на ўласным станоўчым прыкладзе. Немалаважным складнікам поспеху ў выхаванні з'яўляецца і павышэнне узроўню матывацыі на фарміраванне паўнавартаснай, высокаразвітай асобы, якое апошнім часам становіцца ўсё больш уласцівым для гарадской сям'і.

Вызначаныя новыя з'явы ў сферы роднасна-сваяцкіх і бацькоўска-дзіцячых адносін павінны стымуляваць дзейнасць устаноў адукацыі і сацыякультурнай сферы, садзейнічаць аптымізацыі работы з будучымі бацькамі, маладымі сем'ямі. Апрабаванай у часе формай работы з бацькамі могуць стаць народныя бацькоўскія універсітэты, якія існавалі ў 70–80-я гады XX ст. Адраджэнне гэтага напрамку работы з бацькамі можа паспрыяць павышэнню педагагічнай культуры ў сям'і, прафілактыцы сацыяльнага сіроцтва, прадухіленню негатыўных з'яў у побыце.

Характар этнакультурных працэсаў, узровень захаванасці традыцый, іх аднаўленне і ўзбагачэнне новымі тэндэнцыямі ўказваюць на актыўную запатрабаванасць традыцый у сучаснай сям'і беларусаў. Вясельныя, радзінныя абрады, абрады ўшанавання продкаў выконваюцца многімі гарадскімі сем'ямі, а прытрымліванне традыцыі народнага выхавання і этыкету, каляндарнай абраднасці з'яўляецца асновай паўнавартасных сямейных адносін. Для этнакультурных працэсаў у гарадской сям'і беларусаў характэрна такая рыса, як адаптаванасць традыцыйнай культуры да сучасных умоў.

7. Аптымізацыя этнакультурных працэсаў у сям'і беларусаў-гараджан магчыма ў спецыяльна арганізаваных умовах – установах адукацыі і сацыякультурнай сферы. У апошняй трэці XX – пачатку XXI ст. гэтымі ўстановамі назапашаны багаты вопыт работы з дзецьмі, моладдзю і сем'ямі, створана сістэма работы з вучнёўскай моладдзю. Запатрабаванымі кірункамі працы з'яўляюцца арганізацыя вольнага часу (праз развіццё аматарскіх клубных аб'яднанняў, творчых майстэрань, правядзенне конкурсаў і фестываляў сямейнай творчасці), краязнаўчая і турысцка-экскурсійная праца (праз валанцёрскую дзейнасць) і інш.

Аднак аналіз дзейнасці многіх з іх паказвае, што неабходна весці больш мэтанакіраваную работу па ўключэнні маладых пакаленняў беларусаў у актыўную дзейнасць па вывучэнні і творчым засвойванні нацыянальных традыцый.

8. Падрыхтоўка моладзі да сямейнага жыцця – важнейшы напрамак дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі, рэалізацыя якога можа быць эфектыўнай у вышэйшай школе.

Сучасная вышэйшая школа – гэта не толькі школа атрымання прафесійнай адукацыі, але і школа сацыялізацыі, набыцця сацыяльнага вопыту. Студэнцтва – сацыяльна значная група дашлюбнай моладзі, здольная ў бліжэйшыя гады рэалізаваць свой патэнцыял у якасці бацькоў, стварыць сям'ю, ідэаламі якой будуць каштоўнасці нацыянальнай культуры.

Асноўныя напрамкі працы з дашлюбнай моладдзю павінны быць скіраваны на падрыхтоўку моладзі да сямейнага жыцця, фарміраванне культуры сямейных адносін у маладых сем'ях, выхаванне адказнага бацькоўства. Актуальным і новым

напрамкам працы з моладдзю з'яўляецца навучанне полікультурнай граматнасці, што будзе спрыяць выпрацоўцы механізмаў адаптацыі і ўстойлівасці асобы да іншых культур і зберажэнню сваёй нацыянальнай ідэнтычнасці, умацаванню сям'і і сямейных адносін.

Стварэнне кадравай структуры ў сістэме вышэйшай школы, якая забяспечвае работу з моладдзю, – неабходная ўмова прасоўвання ідэй мэтанакіраванай падрыхтоўкі моладзі да сямейнага жыцця і працы з маладымі сем'ямі.

**Асабісты ўклад суіскальніка**

Дысертацыя ўяўляе самастойна выкананае комплекснае даследаванне, у рамках якога:

распрацаваны новы тэарэтыка-метадалагічны падыход у даследаванні этнакультурных працэсаў у сям'і беларусаў; выяўлены і раскрыты сутнасць этнакультурных працэсаў у кантэксце даследаванняў сучаснай айчыннай этналогіі, спецыфіка іх функцыянавання ва ўмовах горада ў перыяд апошняй трэці XX – пачатку XXI ст.;

комплексна прааналізаваны механізм пераемнасці традыцый як фундаментальнага прынцыпа функцыянавання і рэпрадуктавання этнакультурных працэсаў у сям'і; даследаваны традыцыі і інавацыі ў этнакультурным комплексе сямейна-бытавых абрадаў у залежнасці ад тыпу горада; акрэслены іх уплыў на этнакультурныя працэсы, іх аднаўленне, паскарэнне і ўзбагачэнне новымі тэндэнцыямі; выяўлена станаўленне мадэлі новага тыпу ў роднасна-сваяцкіх і бацькоўска-дзіцячых адносінах;

акрэслены асноўныя шляхі рэалізацыі сацыяльна-педагагічнага і выхаваўчага патэнцыялу нацыянальных традыцый у працы з дзецьмі, моладдзю і сям'ёй;

распрацаваны напрамкі фарміравання адносін моладзі да сямейнага жыцця ў кантэксце мэт і задач дзяржаўнай сямейнай палітыкі.

У выніку навукова-даследчай працы сабраны і прааналізаваны матэрыялы апытанняў, этнасацыялагічных даследаванняў (*першае* праведзена ў 1992–1994 гг. у г.Мінску, *другое* – у 2007 г. у 30 гарадах: у г. Мінску, буйных, сярэдніх і малых гарадах Беларусі), інтэрв'ю (усяго было апытана 2075 чалавек – дарослых членаў сям'і і дзяцей, гарадскіх жыхароў; з іх – 1692 чалавекі – гэта бацькі, настаўнікі, спецыялісты; 383 чалавекі – дзеці, падлеткі, студэнцкая моладзь). Упершыню сістэмна даследавана праблема сям'і і шлюбу, сямейна-бытавой культуры беларусаў-гараджан на працягу 1989–2009 гг., калі адбыліся змяненні ў статусе Рэспублікі Беларусь, былі сфарміраваны асновы яе дзяржаўнасці, вызначаны прыярытэты развіцця ў навейшы час, важнейшымі сярод якіх з'яўляюцца сям'я і дзеці, захаванне пераемнасці традыцый паміж пакаленнямі.

Вывады, палажэнні, рэкамендацыі, якія змешчаны ў дысертацыі, распрацаваны аўтарам самастойна.

**Апрабацыя вынікаў даследавання**

Апрабацыя вынікаў даследавання праводзілася на навукова-творчай канферэнцыі «Актуальныя праблемы і навуковыя пошукі ў галіне культуры і мастацтва» (г. Мінск, 19–20 красавіка 1994 г.); Міжнароднай канферэнцыі «Адукацыя і нацыянальна-культурнае адраджэнне» (г. Мінск, 25–26 кастрычніка 1994 г.); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Сістэма гуманітарызацыі адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь: канцэптуальныя асновы, мадэлі, узроўні кіравання» (г. Мінск, 28 верасня 1996 г.); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Актуальныя праблемы сацыяльна-псіхалагічнай дапамогі сям'і: тэорыя і практыка» (г. Мінск, 28–29 лістапада 2000 г.); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Усходнеславянскія краіны ў эпоху глабалізацыі: выбар шляхоў развіцця» (г. Гродна, 26–27 лістапада 2003 г.); Міжнароднай навукова-метадычнай канферэнцыі «Універсітэцкая адукацыя і навука ў XXI стагоддзі» (г. Мінск, 24 кастрычніка 2003 г.); V Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Менталітэт славян і інтэграцыйныя працэсы: гісторыя, сучаснасць, перспектывы» (г. Гомель, 24–25 мая 2007 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 50-гадоваму юбілею інстытута мастацтвазнаўства, этналогіі і фальклору імя Кандрата Крапівы НАН Беларусі, «Мастацтва, фальклор, этнічныя традыцыі ў вырашэнні актуальных задач сучаснай культуры» (г. Мінск, 7–8 чэрвеня 2007 г.); VII кангрэсе этнолагаў і антраполагаў Расіі (г. Саранск, Рэспубліка Мардовія, 2–14 ліпеня 2007 г.); Міжнароднай канферэнцыі «Міжкультурны і міжрэлігійны дыялог у мэтах устойлівага развіцця» (г. Масква, 13–16 верасня 2007 г.); IV Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі «Традыцыйная культура і дзеці: праблемы этнавыхавання» (г. п. Акцябрскі Гомельскай вобл., 2–3 красавіка 2008 г.); Рэгіянальнай навукова-метадычнай канферэнцыі, прысвечанай 15-годдзю гісторыка-этнаграфічнага музея БДУФК, «Грамадзянскае выхаванне студэнтаў: традыцыі і навацыі» (г. Мінск, 18 красавіка 2008 г.); Міжнароднай навуковай канфэрэнцыі «Праблемы вывучэння культурных сувязей на этнакантактных тэрыторыях у славянскім свеце» (г. Мінск, 22–23 мая 2008 г.); VII Міжнароднай навукова-метадычнай канфэрэнцыі «Беларусь у сучасным свеце» (г. Мінск, 30 кастрычніка 2008 г.); X Свята-Еўфрасіннеўскіх чытаннях (г. Мінск, 4–5 лістапада 2008 г.); IV Міжнароднай канферэнцыі «Палявая этнаграфія» (г. Санкт-Пецярбург, 27–29 лістапада 2008 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Жаночая і гендэрная гісторыя Айчыны X–XXI стст.: новыя праблемы і перспектывы» (г. Петразаводск, 19–21 чэрвеня 2009 г.); VIII кангрэсе этнолагаў і антраполагаў Расіі (г. Арэнбург, 1–5 ліпеня 2009 г.); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Традыцыі і сучаснае становішча культуры і мастацтваў» (г. Мінск, 24–25 верасня 2009 г.).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі**

Па праблемах дысертацыйнага даследавання аўтарам апублікаваны адна манаграфія (аб'ём 16,05 аўт. арк.), 20 артыкулаў у выданнях, уключаных у Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў (10 аўт. арк.), 4 навукова-метадычныя дапаможнікі (30,2 аўт. арк.), 19 артыкулаў у часопісах, зборніках і кнігах (14,5 аўт. арк.), 7

дакладаў навуковых канферэнцый (3 аўт. арк.), 15 тэзісаў дакладаў навуковых канферэнцый (4,7 аўт. арк.), 6 вучэбных праграм, метадычных рэкамендацый (6,9 аўт. арк.), 5 артыкулаў у даведачных і энцыклапедычных выданнях (0,3 аўт. арк.), усяго ў аб'ёме больш за 80 аўтарскіх аркушаў.

**Структура і аб'ём дысертацыі**

Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, чатырох глаў, заключэння (214 старонак тэксту, 37 табліц, 9 малюнкаў), бібліяграфічнага спіса (41 старонка), у які ўключаны спіс выкарыстаных крыніц (475 найменняў, 11 найменняў архіўных крыніц) і спіс публікацый суіскальніка (82 найменні), двух дадаткаў на 23 старонках.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

**Глава 1 «Тэарэтыка-метадалагічныя асновы дынамікі этнакультурных працэсаў у гарадской сям'і беларусаў у апошняй трэці ХХ – пачатку ХХІ ст.»** уключае аналітычны агляд літаратуры па тэме; ацэнку ступені даследаванасці праблемы і абгрунтаванне метадалогіі. У параграфе 1.1 ***«Гістарыяграфія праблемы сям'і, крыніцы і метады даследавання»*** аналізуюцца бібліяграфічныя крыніцы даследавання, прыводзяцца крытэрыі выбару напрамкаў дысертацыйнага даследавання.

У выніку даследавання этнакультурных працэсаў вылучаны наступныя перыяды: *першы* – 70–80-я гады ХХ ст.; *другі* – 80–90-я гады ХХ ст.; *трэці* – 1991 г. – пачатак ХХІ ст. У даследаванні ўказаны значныя распрацоўкі новых навуковых напрамкаў, прааналізаваны некаторыя этналагічныя працы еўрапейскіх навукоўцаў, якія даследавалі не толькі сямейныя традыцыі народаў Еўропы, але і сямейна-бытавую культуру ўсходнеславянскіх народаў, традыцыі рускага, украінскага, беларускага народаў. У 70–80-я гады ХХ ст. беларускімі этнолагамі вывучаліся тэндэнцыі этнакультурнага развіцця сям'і і шлюбна-сямейных адносін, ацэньвалася структура сям'і, яе функцыі і змяненні ў тыпалогіі (У. М. Іваноў, С. А. Польскі, М. Ф. Піліпенка, В. К. Бандарчык, А. М. Міцкевіч, В. М. Бялявіна, Э. Р. Сабаленка, Г. І. Каспяровіч, І. М. Браім, Т. І. Кухаронак).

Даследаванні сямейных працэсаў праводзіліся ў перыяд адаптацыі сельскіх жыхароў да гарадскіх умоў жыцця. Этнічныя аспекты сямейна-роднасных стасункаў, традыцыі і сямейныя абрады народаў Расіі, Украіны, Беларусі вывучаліся заходнімі і расійскімі вучонымі (Р. Дражава, Ю. Касцельнік, О. Зільньскі, Н. Л. Пушкарова, В. А. Ганцкая, Д. Маркоўска, К. Клузова, Я. Юроўскі, Х. Шельскі і інш.). У працах еўрапейскіх вучоных аналізавалася становішча сям'і ў перыяд нарастання урбанізацыйных працэсаў, вывучаліся тэндэнцыі ўплыву міграцыі на ўнутрысямейныя адносіны, функцыі сям'і, сямейна-абрадавую культуру.

У 80–90-я гады XX ст. працягвалася вывучэнне духоўнай, матэрыяльнай і сацыяльнай культуры беларусаў (В. К. Бандарчык, А. І. Лакотка, Л. А. Боцань, Л. І. Мінько, Л. В. Ракава, Г. М. Курыловіч, Т. І. Кухаронак, В. С. Цітоў, І. П. Корзун, С. А. Мілючэнкаў). У працах этнолагаў вытрыманы прынцып пераемнасці і пашырэння тэматыкі даследаванняў. Пачынаюць узнімацца вострыя сацыяльныя пытанні: уплыў сямейных канфліктаў на самаадчуванне сям'і, праблемы п'янства бацькоў, сацыяльнае сіроцтва, псіхалагічны і маральны мікраклімат у сям'і, праявы перарванасці сувязі паміж пакаленнямі. Гэтыя праблемы закранаюцца не толькі этнолагамі, але і сацыёлагамі, філосафамі як спецыялістамі сумежных з этналогіяй навук (А. Г. Харчавым, Л.І. Шахоцька, Л. М. Гарбаценкавай, М. Г. Юркевічам і інш.).

У даследаваннях сям'і ўсходнеславянскіх народаў замежнымі навукоўцамі фарміруецца новы погляд на вывучэнне сям'і і сямейных адносін: пашыраецца тэматыка даследаванняў, іх сацыяльная значнасць. У гэты перыяд назіраюцца агульныя тэндэнцыі ў навуковых працах, прысвечаных беларускаму і еўрапейскім народам, вывучаюцца сямейныя традыцыі, ступень іх захаванасці ў побыце, уплыў міжнацыянальных шлюбаў на культурныя традыцыі асобных народаў і інш. (Ф. Нойрайтэр, Ф. Шольц, М. Аляхновіч і інш.).

У 90-я гады XX – пачатку XXI ст. у айчыннай этналогіі традыцыйная тэматыка пашыраецца даследаваннем этнасацыяльных праблем сям'і, шлюбу, бацькоўства, дзяцінства, урбанізацыйных працэсаў у Беларусі і іх уплыву на структуру гарадскога насельніцтва, уздымаюцца дэмаграфічныя пытанні, аналізуюцца сацыяльная значнасць бацькоўства, рэпрадуктыўная і выхаваўчая функцыі сям'і (Г. М. Курыловіч, І. У. Чаквін, І. Р. Углік, Т. І. Кухаронак, Л. В. Ракава).

Праблематыка сям'і і традыцый вывучаецца І. І. Калачовай, Т. А. Навагродскім, Н. Я. Луйгас і інш. Г. І. Каспяровіч, М. Ф. Піліпенка, А. В. Гурко, А. У. Гурко даследуюць этнакультурныя працэсы ў канцы XX – пачатку XXI ст., сучасныя працэсы этнічнай гісторыі – дзяржаўныя, каляндарныя і хрысціянскія святы, прафесійную культуру беларусаў. Значны ўклад у распрацоўку спецыяльных напрамкаў этналогіі, у прыватнасці этнапедагогікі, унеслі беларускія навукоўцы Г. П. Арлова, Г. А. Барташэвіч, В. С. Болбас, А. А. Грымаць, С. П. Жлоба, В. П. Канаш, В. А. Салееў, В. У. Чэчат і інш.

Новы віток у сваім развіцці набылі сацыяльныя навукі, сярод якіх выдзяляецца сацыялогія сям'і. Сацыялагічныя пытанні развіцця сям'і, сацыялогію сям'і вывучаюць беларускія сацыёлагі і філосафы С. Д. Лапцёнак, Ю. М. Бубноў, С. Н. Бурава, А. К. Воднева. У рэчышчы сацыялогіі развіццё атрымалі і іншыя значныя галіны ведаў – гэта сацыяльная работа, сацыяльная педагогіка, сацыяльная псіхалогія (Э. І. Збароўскі, Я. Л. Каламінскі, Ж. І. Міцкевіч, В. Г. Сянько, А.А. Аладзін, А. М. Сізанаў).

Аўтар абагуліў вынікі даследаванняў, прыведзеныя ў працах замежных даследчыкаў, у якіх назіраецца цікавасць да новых форм шлюбу, што з'явіліся ў еўрапейскіх краінах і закранулі традыцыйныя стэрэатыпы адносна сям'і і шлюбу (М. К. Любарт, М. У. Залатухіна, А. А. Сарокіна, С. А. Пракапенка).

Аналіз бібліяграфічных крыніц выяўляе адсутнасць у айчыннай этналогіі спецыяльнага комплекснага даследавання этнакультурных працэсаў у гарадской сям'і беларусаў у апошняй трэці XX – пачатку XXI ст., адсутнасць аналізу тэндэнцый іх функцыянавання па такіх аспектах, як трансфармацыі ў структуры сям'і, працэс мадэрнізацыі традыцый у сям'і, механізм трансляцыі этнакультурных ведаў, захаванне цэласнасці этнакультурнага комплексу сямейна-бытавых абрадаў, сучасныя мадэлі роднасна-сваяцкіх, бацькоўска-дзіцячых і міжпакаленных адносін, традыцыі выхавання і сацыялізацыі.

Для абгрунтавання аўтарскай канцэпцыі даследавання дынамікі этнакультурнага развіцця выкарыстаны шырокі спектр бібліяграфічных крыніц па гісторыі, этналогіі, дэмаграфіі, філасофіі, культуралогіі, сацыялогіі, педагогіцы і псіхалогіі. Канцэпцыя і напрамкі дысертацыйнага даследавання абумоўлены спецыфікай і характарам працякання этнакультурных працэсаў у сям'і ў кантэксце гарадскога ўкладу жыцця, задачамі, якія дазволяць прадставіць тэндэнцыі змяненняў у сям'і і шлюбе беларусаў у постсавецкі перыяд, на новым этапе развіцця этнічнай гісторыі.

Праблема сям'і і шлюбу даследавалася праз вывучэнне архіўных матэрыялаў, статыстычных даных, перапісаў насельніцтва. Выкарыстаны традыцыйныя для этналогіі метады, такія як гісторыка-параўнальны аналіз, метад гістарычнай рэканструкцыі, метад палявых даследаванняў, метад апытання (інтэрв'ю), шырока выкарыстаны метад этнасацыялагічнага даследавання. Праведзена два этнасацыялагічных апытанні сем'яў беларусаў: у 1992–1994 гг. у Мінску (было апытана 1098 бацькоў і іх дзяцей, сярод іх 767 дарослых, 331 дзіця) і ў 2007 г. у 30 гарадах рэспублікі (апытана 800 сем'яў). У ходзе апошняга этнасацыялагічнага даследавання апытаны ў Мінску 191 чалавек (23,9 %), у буйных гарадах (Брэст, Віцебск, Гомель, Гродна, Магілёў) – 208 чалавек (26 %), у сярэдніх гарадах (Баранавічы, Полацк, Мазыр, Ліда, Салігорск, Маладзечна, Бабруйск) – 190 чалавек (23,8 %), у малых гарадах (Іванава, Камянец, Жабінка, Докшыцы, Талачын, Ветка, Хойнікі, Буда-Кашалёва, Вялікая Бераставіца, Скідаль, Беразіно, Слуцк, Жодзіна, Чэрвень, Клецк, Мсціслаў, Чэрыкаў) – 211 чалавек (26,3 %). Для правядзення даследавання выкарыстоўвалася спецыяльна распрацаваная камбінаваная шматузроўневая выбарка. Матэрыялы, атрыманыя ў ходзе даследавання, апрацаваны матэматычным спосабам.

Значную групу складаюць матэрыялы апытанняў, атрыманых у ходзе правядзення стандартызаваных і паўстандартызаваных інтэрв'ю з гараджанамі з Мінска, Навагрудка, Гродна, Гомеля, Оршы, Рэчыцы, Магілёва, Полацка, Наваполацка, Віцебска, Горак, Калінкавіч, Пінска (100 чалавек); са спецыялістамі сістэмы прафесіянальна-тэхнічнай і вышэйшай адукацыі (апытана 25 чалавек); студэнтамі вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі (апытана 52 чалавекі).

У параграфе 1.2 ***«Тэарэтыка-метадалагічная канцэпцыя даследавання этнакультурных працэсаў у сям'і беларусаў»*** разглядаецца метадалагічная канцэпцыя даследавання, складнікі яе асноўных ідэй.

У аснову вывучэння этнакультурных працэсаў пакладзены вядучыя палажэнні тэорыі эвалюцыі (І. Я. Бахофен, Дж. Ф. Мак-Ленан, Л. Г. Морган,

А. Конт, М. М. Кавалеўскі, А. М. Харузін, А. Ф. Занкевіч, С. П. Талстоў, М. Я. Ні-кіфароўскі, М. М. Нікольскі, П. В. Шэйн, А. Я. Багдановіч, М. В. Доўнар-За-польскі, Я. Ф. Карскі, Е. Р. Раманаў, В. К. Бандарчык, М. Ф. Піліпенка); тэорыі мадэрнізацыі (К. Маркс, М. Вебер, Д. Бэл, Ф. Тэніс, Ч. Кулі, Г. Мейн, Ш. Мантэск'ё, Ж.-Ж. Русо, У. Мур, М. Нэш, Б. Хігінс, Э. Дзюркгейм, В. Л. Іназемцаў, С. Н. Гаўраў, Г. У. Салдатава, Н. М. Лебедзева, З. В. Сікевіч, А. М. Татарка, М. А. Казлова, Н. А. Цярэшчанка, Т. М. Шатунова, Л. П. Вараб'ёва, Л. А. Пуціліна, М. А. Мажэйка); тэорыі каштоўнасцей (П. Лакі, Г. Рыкерт, В. Вільдэльбант, М. Вебер, С. Ф. Анісімаў, В. А. Васільеў, А. Г. Здравамыслаў, А. А. Івін, В. Келе, В. В. Крукаў, М. К. Мамардашвілі, М. С. Розаў, С. Л. Рубінштэйн, С. Н. Сталовіч, В. П. Тугарынаў, М. Б. Туроўскі, В. Ядаў, С. Я. Рыбакоў) і тэорыі полікультурнасці (Д. Г. Дзмітрыеў, Д. В. Сажын, В. А. Цішкоў, М. Ю. Мартынава, Л. М. Дробіжава і інш.).

Выбар прыведзеных тэарэтычных палажэнняў абгрунтаваны і значны для дадзенага даследавання з пазіцыі задач, якія вырашаліся ў краіне ў перыяд 70–80-х гадоў ХХ ст.; у 80-90-я гады ХХ ст. і з 90-х гадоў ХХ ст. да сёння. У канцэпцыях указваецца, што на дынаміку этнакультурных працэсаў у сям'і значны ўплыў аказваюць фактары палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця. У 70–80-я гады ХХ ст. беларускімі этнолагамі сям'я вывучалася ў кантэксце эвалюцыйнай тэорыі, што было абумоўлена распаўсюджанасцю ідэй адналінейнага, а гэта значыць аднавектарнага развіцця грамадства і ўсіх грамадскіх інстытутаў, у тым ліку і сям'і. У 80–90-я гады ХХ ст., у новых абставінах, якія былі абумоўлены трансфармацыямі на постсавецкай прасторы, афармленне атрымала тэорыя мадэрнізацыі, якая пачала сваё развіццё ў пачатку ХХ ст., а пазней, у канцы ХХ – пачатку ХХІ ст., – тэорыя постмадэрнізацыі (Э. Гідэнс, Ж. Бадрыяр, Ж. Батай, М. Бланшо, Ж.-Ф. Ліатар, М. Кастэльс, Ф. Тураў і інш.). У рамках тэорыі мадэрнізацыі разгледжаны важнейшыя пытанні жыццядзейнасці сям'і ва ўмовах мадэрнізаваных і посттрадыцыйных грамадстваў – гэта пытанні змянення ўкладу жыцця, яе сацыяльна-эканамічнага становішча і, як вынік, – фарміраванне новай парадыгмы каштоўнасных арыенціраў асобы. У кантэксце транфармацый канца ХХ ст. сфарміраваўся абноўлены навуковы погляд на этнасы і сутнасць этнічнага. Былі акрэслены новыя тэндэнцыі ў развіцці этнасу, вызначана новая адметнасць ў функцыянаванні традыцыі, напрыклад такая, як мадэрнізаванасць, і інш.

Пры параўнанні ўкладаў жыцця ў традыцыйным грамадстве і грамадстве мадэрнізаваным выяўляюцца нешматлікія новыя тэндэнцыі ў развіцці этнасу. Калі істотнай адметнасцю традыцыйнага грамадства з'яўляецца калектывізм, то мадэрнізаванаму, разам з калектывізмам, пачынае быць уласцівым і індывідуалізм. Аднак першая рыса ўсё ж застаецца вызначальнай.

Калектывізм як каштоўнасць укладу жыцця традыцыйнага грамадства ляжыць у аснове пераемнасці традыцый паміж сем'ямі, родамі, пакаленнямі, а значыць, і ў аснове мадэліравання ўзораў жыцця на прыкладзе мінулага вопыту. Індывідуалізм як новая рыса мадэрнізаванага грамадства садзейнічае фарміраванню новага тыпу пераемнасці традыцый, пры якім механізм адносін

паміж сем'ямі, родамі, пакаленнямі не падмяняецца, а дапаўняецца новымі асаблівасцямі, абумоўленымі патрабаваннямі часу.

У параграфе 1.3 ***«Мадэрнізацыя і урбанізацыя ўкладу жыцця як аснова тэарэтычнай канцэпцыі даследавання дынамікі этнакультурных працэсаў у сям'і беларусаў»*** разглядаюцца асноўныя характарыстыкі гарадскога ўкладу жыцця ў кантэксце працэсаў урбанізацыі і мадэрнізацыі, змяненні ў сямейным побыце ва ўмовах новай этнакультурнай сітуацыі.

Важнейшым фактарам дынамікі этнакультурных працэсаў у сям'і з'яўляецца гарадскі ўклад жыцця насельніцтва. Даныя статыстыкі ўказваюць, што пачынаючы з 60–70-х гадоў XX ст. на Беларусі пачаліся працэсы інтэнсіўнага перамяшчэння сельскага насельніцтва ў гарады, якія спрыялі павелічэнню удзельнай вагі гарадскога насельніцтва. У 1970 г. гэты паказчык складаў 42,7 %; у 1975 г. – 49,1; у 1980 г. – 55,9; у 1985 г. – 61,2; у 1990 г. – 66,1; у 1995 г. – 67,91; у 2000 г. – 69,7; у 2005 г. – 72,0; у 2009 г – 73,9 %.

Сёння сістэма рассялення ў рэспубліцы сфарміравана наступным чынам. Цэнтрамі рассялення нацыянальнага значэння з'уляюцца 5 буйных (абласных) гарадоў і г.Мінск. Цэнтрамі рассялення рэгіянальнага значэння з'яўляюцца 11 гарадоў з насельніцтвам ад 100 да 250 тыс. чалавек. Гэта Баранавічы, Бабруйск, Орша, Барысаў, Наваполацк, Пінск, Мазыр, Салігорск, а таксама Ліда, Маладзечна, Полацк. Цэнтрамі рассялення міжраённага значэння з'яўляюцца 7 гарадоў з насельніцтвам ад 50 да 75 тыс. чалавек – Жлобін, Жодзіна, Кобрын, Рэчыца, Светлагорск, Слонім, Слуцк. Такая інфраструктура рассялення жыхароў фарміравалася пад уплывам працэсаў урбанізацыі, якія на тэрыторыі Беларусі развіваліся вельмі інтэнсіўна. Адным з інавацыйных эксперыментаў на Беларусі, які быў увасоблены ў якасці механізма рэгулявання працэсаў урбанізацыі, стала стварэнне гарадскіх агламерацый – гарадоў і пасёлкаў, што былі сфарміраваны вакол буйных гарадоў. Да іх адносіліся Мінская агламерацыя, якая ўключала гарады Барысаў, Жодзіна, Маладзечна, Смаргонь, Вілейку і сельскія населеныя пункты – Ракаў, Лясное–Бараўляны, Гатава, Смілавічы, Самахвалавічы, Фаніпаль і інш. Адначасова былі сфарміраваны агламерацыі уздоўж дарог – Гродна–Пінск, што дазволіла аб'яднаць раёны Мастоў, Ваўкавыска, Слоніма, Івацэвічаў, а таксама агламерацыя Бабруйск–Магілёў, што аб'яднала Асіповічы, Рагачоў, Жлобін, Светлагорск, Рэчыцу, Добруш і інш.

Фарміраванне структуры гарадскога насельніцтва краіны адбывалася ў асноўным за кошт пераезду сельскіх жыхароў. Асноўную долю перасяленцаў складаюць сельскія жыхары, якія, як правіла, належаць да беларускай нацыянальнасці. Менавіта яны прадстаўляюць значны слой насельніцтва працаздольнага ўзросту і з'яўляюцца захавальнікамі традыцыйнага пласта культуры і нацыянальных традыцый, што выяўляецца ў святочным і штодзённым побыце гараджан, укладзе жыцця. Імі падтрымліваюцца традыцыйныя сямейна-бытавыя абрады беларусаў, аднак многія элементы трансфармуюцца ці бытуюць у іншым выглядзе. Напрыклад, у вясельнай традыцыі існуюць абрады заручын, суборнай суботы, прыезд маладога да маладой, адорванні, падзел каравая і інш. Аднак у некаторых з іх захаваліся толькі элементы. Абрад «заручыны» мае іншыя

абрысы: заручанымі лічацца маладыя ў перыяд чакання афіцыйнай рэгістрацыі ў органах ЗАГС, а сватанне – гэта першая сустрэча бацькоў маладых з мэтай дамовы аб арганізацыі вяселля.

Вызначальным фактарам, які ўплывае на сямейную культуру гараджан, становіцца іх здольнасць падтрымліваць традыцыйную абраднасць, звычаі – усё тое, што з'яўляецца асновай багатай нацыянальнай спадчыны, назапашанай папярэднімі пакаленнямі беларусаў. Нельга не пагадзіцца з меркаваннямі вучоных аб тым, што большасць этнакультурных з'яў – звычаяў, абрадаў, традыцый – нараджаецца ў сельскім асяроддзі, затым яны трансфармуюцца,аднаўляюцца ў гарадскім асяроддзі і зноў вяртаюцца ў вёску. Так адбываецца мадэрнізацыя традыцый і горад становіцца асяроддзем, якое спрыяе ўкараненню адноўленых традыцый, што застаюцца прывабнымі для ўсіх пакаленняў гараджан, але асабліва значнымі для маладых пакаленняў.

Такім чынам, з аднаго боку, горад – гэта асяроддзе інавацыйнасці, высокай тэхналагічнасці, а з другога, – асяроддзе кансервацыі ўстояў і традыцый, якія захоўваюцца ў сям'і. Сям'я беларусаў як актыўны творца гарадскога ўкладу жыцця імкнецца захаваць традыцыйнасць, гарманічна спалучае ў сямейным побыце і традыцыі і інавацыі.

У главе 2 **«Стан і тэндэнцыі развіцця этнакультурных працэсаў у гарадской сям'і беларусаў»** паказваецца дынаміка змяненняў у сям'і і шлюбна-сямейных адносінах. У параграфе 2.1 ***«Структурна-функцыянальныя і тыпалагічныя змяненні гарадской сям'і беларусаў»*** разглядаюцца працэсы трансфармацый у структуры, функцыях, тыпалогіі сям'і.

Інавацыйныя працэсы ў грамадскім развіцці адбіваюцца на характары этнакультурнай сітуацыі ў сям'і. З'яўляюцца новыя сродкі камунікацый, развіваюцца сучасныя тэхналогіі, якія становяцца вызначальнай рысай штодзённага жыцця сям'і. Новы ўзровень тэхналагічнага развіцця закранае грамадскія працэсы, патрабуе пошуку новых мадэлей у адносінах паміж людзьмі, нараджае новыя правілы маралі і этыкі. Асаблівасці ў працяканні этнакультурных працэсаў уплываюць на формы сям'і і шлюбу, яе структуру і шлюбна-сямейныя адносіны, функцыі, тыпалогію, склад.

Распаўсюджаным тыпам сучаснай сям'і з'яўляецца нуклеарная (малая) сям'я, у якой жывуць бацькі і іх дзеці (двухпакаленныя сем'і). Менш распасюджаным тыпам – пашыраныя ці ўскладненыя (трохпакаленныя). Частку сем'яў складаюць няпоўныя сем'і, у якіх пражываюць ці бацька, ці маці з дзецьмі; пазашлюбныя сем'і, у якіх пражываюць, як правіла, маці з дзіцем, народжаным па-за афіцыйна прызнаным шлюбам; сем'і ў паўторным шлюбе; маладыя сем'і; бяздзетныя сем'і.

Структурна-функцыянальныя і тыпалагічныя змяненні ў сям'і больш выразна выяўляюцца ў параўнальным аспекце: калі традыцыйная сям'я ўяўляла з сябе нераздзеленую сям'ю (з пражываннем некалькіх пакаленняў і вядзеннем агульнай гаспадаркі), то сучасныя сем'і – гэта, як правіла, двухпакаленныя сем'і з ядром «маці, бацька, дзеці». Трэба сказаць, што менавіта ў разглядаемы перыяд адрозненні паміж традыцыйнымі і сучаснымі сем'ямі ў гэтым сэнсе паступова сціралася. Асабліва гэтыя працэсы былі адчувальныя ў перыяд інтэнсіфікацыі

міграцыйных працэсаў – у 60–70-я гады XX ст., калі моладзь стала пераязджаць з вёсак у гарады і ствараць там сем’і, нараджаць менш дзяцей у параўнанні з іх бацькамі.

Для сучаснай сям’і беларусаў характэрны пэўны набор функцый, як спецыфічных, так і неспецыфічных, прычым для абодвух тыпаў найбольш уласцівы спецыфічныя: рэпрадуктыўная (нараджэнне дзяцей), экзістэнцыяльная (забеспячэнне дзяцей) і функцыя сацыялізацыі (выхаваўчая). Аднак у сучаснай сям’і дастатковую ўстойлівасць і пашыранае бытаванне набываюць і неспецыфічныя функцыі, сярод якіх вызначаюцца функцыі назапашвання і перадачы ў спадчыну маёмасці, функцыя забеспячэння спрыяльнага псіхалагічнага мікраклімату, функцыя камунікацый і сацыяльных зносін і інш.

Важным крытэрыем ацэнкі развіцця сям’і з’яўляецца дзетнасць (або колькасць дзяцей у сям’і). Выдзяляюцца тры тыпы сем’яў: маладзетныя, сярэднядзетныя, шматдзетныя. Маладзетныя характарызуюцца наяўнасцю аднаго-двух дзяцей; сярэднядзетныя – трох-чатырох; шматдзетныя – маюць пяць і больш дзяцей. Характэрнай асаблівасцю традыцыйнай сям’і беларусаў з’яўлялася шматдзетнасць, у рамках якой забяспечвалася больш устойлівая традыцыя міжпакаленных сувязей і перадачы этнічных ведаў, у той час як сучаснай сям’і беларусаў уласціва маладзетнасць, што перашкаджае забеспячэнню пэўнага ўзроўню міжпакаленнай перадачы ведаў, паколькі па меры змяншэння колькасці членаў сям’і непазбежна адбываецца аслабленне традыцый міжпакаленных сувязей.

На сучасным этапе адной з важнейшых задач дэмаграфічнай палітыкі з’яўляецца павелічэнне колькасці дзяцей у сям’і і падтрымка шматдзетных сем’яў.

У параграфе 2.2 ***«Трансфармацыя сям’і і шлюбу гараджан»*** раскрываецца эвалюцыя сямейна-шлюбных адносін, даецца ацэнка працэсаў, якія іх суправаджаюць. У канцы XX – пачатку XXI ст. значна перапрацаваны і дапоўнены новымі артыкуламі заканадаўчыя дакументы аб сям’і і шлюбе, што паспрыяла ўзмацненню ролі сям’і ў грамадстве, каштоўнасцей бацькоўства і мацярынства. Асноўны юрыдычны дакумент – Кодэкс аб шлюбе і сям’і Рэспублікі Беларусь, які дзейнічаў у 60–90-х гадах XX ст., адноўлены. У адрозненне ад дакумента 1960–1990-х гадоў новая рэдакцыя Кодэкса ўтрымлівае артыкулы, у якіх замацавана палажэнне аб тым, што сям’я – гэта натуральнае асяроддзе пражывання чалавека, найбольш спрыяльны інстытут узгадавання дзяцей, таму выхаванне дзяцей у сям’і абараняецца і падтрымліваецца дзяржавай. Тым самым прызнана, што сям’я – сацыяльна значны інстытут, які выступае гарантам і абаронцам бацькоўства і дзяцінства.

Удасканальваецца маральна-прававая культура сям’і: шлюбны кантракт як новая форма рэгулявання сямейных адносін становіцца фактарам павышэння прававой адукаванасці і культуры насельніцтва. Вынікі этнасацыялагічнага даследавання гарадскіх сямей беларусаў (2007 г.) паказваюць, што станоўчыя адносіны да шлюбнай дамовы выказваюць рэспандэнты з больш высокім узроўнем адукацыі, маладзейшага ўзросту. Жанчыны ў параўнанні з мужчынамі выказваюць больш станоўчыя адносіны да шлюбнай дамовы, лічаць, што такі дакумент – гэта

дзейсны сродак стрымлівання скасавання шлюбу, мера маральнага ўмацавання сям'і. Аднак шлюбная дамова пакуль не мае шырокага ўжывання сярод сямейнага насельніцтва.

Матывацыя ўступлення ў шлюб – падмурак трывалых адносін у сям'і, яе маральнага даўгалецця. Аналіз матывацыі ўступлення ў шлюб сённяшняга пакалення паказвае, што асноўнымі яго матывамі з'яўляюцца каханне і традыцыі нацыянальнай культуры, якія ўключаюць годныя ўяўленні аб сямейным шчасці, аб каштоўнасці нараджэння і выхавання дзяцей. Гэтыя матывы пераважаюць сярод меркаванняў рэспандэнтаў з вышэйшай адукацыяй, дамінуюць сярод прадстаўнікоў старэйшага ўзросту, а таксама сярод рэспандэнтаў з вялікім стажам сямейнага жыцця.

Прыярытэтнай формай заключэння шлюбу ў цяперашні час, як і ў савецкі перыяд, традыцыйна з'яўляецца святочная рэгістрацыя ў органах ЗАГС, якая часта ўключае элементы традыцыйнай вясельнай абраднасці беларусаў. Аднак апошнім часам значная частка рэспандэнтаў, асабліва жыхароў малых гарадоў, рэгіструюць шлюб ва ўстановах культуры: музеях, клубах, бібліятэках. У гэтым выпадку важнейшай прыкметай шлюбнай урачыстасці становіцца абрадавая частка свята. Устойлівай тэндэнцыяй фарміравання шлюбна-сямейных адносін з'яўляецца асвячэнне шлюбу ў храме, якое, як правіла, праводзіцца ў дзень рэгістрацыі шлюбу ў ЗАГСе. Частка апытаных рэспандэнтаў наогул не рэгістравалі шлюб: гэта тэндэнцыя з'яўляецца даволі распаўсюджанай у сучаснасці, яна характарызуе талерантныя адносіны грамадства, найперш моладзі, да грамадзянскіх шлюбаў (сужыцця).

У фарміраванні сучасных рыс сямейнай радзіннай абраднасці захоўваюцца рысы традыцыйнай абраднасці беларусаў, што выяўляецца ў захаванні абраду хрышчэння дзіцяці ў храме і святкаванні хрэсьбін. Важнай прыкметай сучаснага радзіннага абраду з'яўляецца прыхільнасць маладых сям'яў да хрышчэння дзіцяці ў храме. Спалучэнне афіцыйнай дзяржаўнай рэгістрацыі дзяцей з хрышчэннем, а затым святкаванне гэтай падзеі сярод родных, сваякоў і сяброў, часам з выкарыстаннем элементаў традыцыйных радзінных абрадаў, – устойлівая прымета працэсаў этнакультурнага развіцця гарадскіх сем'яў.

У главе 3 **«Пераемнасць традыцый як фактар рэпрадуктавання этнакультурных працэсаў у гарадской сям'і беларусаў»** разглядаецца механізм пераемнасці каляндарных свят, сямейна-бытавых традыцый – вясельнага і радзіннага абрадаў і абраду ўшанавання продкаў, традыцый выхавання і этыкету; даецца абагульняючая характарыстыка сем'яў, якія з'яўляюцца носьбітамі і пераемнікамі ведаў аб каляндарнай абраднасці. У параграфе 3.1 ***«Грамадскія і сямейныя традыцыі»*** ўказваецца, што асаблівае месца ў структуры сямейных традыцый займае каляндарная абраднасць беларусаў.

У 90-я гады XX ст. узмацняецца цікавасць гараджан да народных каляндарных абрадаў. Менавіта ў гэтыя часы былі адроджаны лепшыя каляндарныя святы – Каляды, Вялікдзень, Купалле.

На сучасным этапе каляндарныя звычаі і абрады з'яўляюцца істотнай часткай структуры сямейных традыцый беларусаў: яны ўключаны ў кола

дзяржаўных і сямейных свят, іх калектывісцкі характар, насычанасць традыцыйнай сімволікай, прафесійная пастаноўка і высокае мастацкае майстэрства ўдзельнікаў забяспечваюць выкананне значных для сям'і функцый – выхаваўчай, пазнавальнай, рэкрэацыйнай, кампенсатарнай, эмацыянальна-псіхалагічнай. Захаванасць ведаў аб каляндарных абрадах і святах асабліва выразна праяўляецца на мясцовым, лакальным узроўні. Дадзеная тэндэнцыя характэрна для сямейных жыхароў малых гарадоў, для сем'яў пашыранага складу, сям'яў з вышэйшай адукацыяй, сем'яў, у якіх падтрымліваюцца цесныя сувязі з роднымі беларускай нацыянальнасці.

Сучаснай гарадской сям'ёй беларусаў сфарміравана сістэма перадачы ведаў аб традыцыйнай каляндарнай абраднасці. Носьбітамі першага (асноўнага. – *І. К.*) круга трансляцыі інфармацыі ў выніку скарачэння колькасці членаў сям'і і аслаблення сувязей з пакаленнем бабуль, дзядуль, блізкіх сваякоў з'яўляюцца бацькі.

Значная роля ў атрыманні ведаў надаецца сучасным інфармацыйным сродкам, якія з'яўляюцца каналам хуткай камунікацыйнай сувязі, і інтэрактыўнаму спосабу зносін як распаўсюджанай форме абмену інфармацыяй. Частка гараджан засвойвае традыцыі народнага календара самастойна: праз удзел у фальклорна-этнаграфічных і самадзейных мастацкіх калектывах, аматарскіх аб'яднаннях і клубах па інтарэсах.

На аснове вышэйадзначанага вызначым абагульняючыя характэрныя адметнасці сем'яў, якія належаць да розных груп носьбітаў этнакультурных ведаў.

*Для сем'яў, у якіх актыўнымі носьбітамі этнічнай інфармацыі* аб традыцыйнай каляндарнай абраднасці з'яўляюцца бацькі, уласцівыя такія прыкметы, як: прыналежнасць да першага пакалення гарадскога насельніцтва (тыя апытаныя, якія пераехалі жыць у горад, а іх бацькі не былі гараджанамі); фарміраванне ўяўленняў аб традыцыйнай культуры пад уплывам адукацыі, роднасна-сваяцкіх і сямейных зносін, гарадскога соцыуму. Як правіла, гэта нуклеарныя сем'і, таму кола носьбітаў і транслятараў этнічнай інфармацыі ў іх звужанае. Аднак у такіх сем'ях паслядоўна падтрымліваюцца ўстойлівыя традыцыі годных адносін да нацыянальнай культуры.

*Для сем'яў, у якіх актыўнымі носьбітамі этнічнай інфармацыі* аб традыцыйнай каляндарнай абраднасці *з'яўляюцца бабулі і дзядулі (сваякі)*, характэрны наступныя прыкметы: прыналежнасць да трэцяга пакалення гарадскіх жыхароў (гэта тыя апытаныя, якія нарадзіліся ў горадзе і чые бацькі з'яўляюцца гараджанамі ў другім пакаленні); фарміраванне іх уяўленняў аб традыцыйнай культуры пад ўплывам роднасна-сваяцкіх і сямейных зносін. Гэта сем'і, якія маюць пашыраны склад, і таму нацыянальныя традыцыі міжсямейных і міжпакаленных сувязей аказваюць даволі адчувальны ўплыў на вызначэнне ладу жыцця з прыярытэтным захаваннем і нават паступовым прымнажэннем традыцыйных каштоўнасцей.

*Для сем'яў, якія атрымліваюць этнічную інфармацыю* аб традыцыйнай каляндарнай абраднасці *з літаратуры, друкаваных і электронных мас-медыя,* уласцівы такія прыкметы, як: прыналежнасць да чацвёртага пакалення гарадскіх жыхароў (гэта тыя апытаныя, якія нарадзіліся ў горадзе і чые бацькі былі гараджанамі трэцяга пакалення); фарміраванне іх уяўленняў аб традыцыйнай

культуры пад непасрэдным уплывам роднасна-сваяцкіх зносін, якія дастаткова добра наладжаны ў межах унутрысямейных кантактаў. Гэта прадстаўнікі розных узроставых груп гараджан, на асобаснае станаўленне і светаўспрыманне якіх, як, дарэчы, і на развіццё ментальнасці ў рэчышчы ашчаднага захавання традыцый, значна паўплывалі творы беларускай і сусветнай культуры (літаратуры, мастацтва, сродкаў масавай інфармацыі). Да гэтай групы апытаных адносіцца і малодшае пакаленне – пакаленне дзяцей, станаўленне якіх адбывалася ў пачатку XXI ст., калі карыстанне персанальнымі камп'ютэрамі стала неад'емнай часткай штодзённага жыцця, дзякуючы чаму пачало ажыццяўляцца актыўнае засваенне ўзораў нацыянальнай культуры ва ўсёй іх паўнаце і шматстайнасці.

*Для сем'яў, у якіх найпершай крыніцай этнічнай інфармацыі з'яўляецца ўдзел у працы фальклорна-этнаграфічных калектываў: сямейных ансамблях, аркестрах народных інструментаў, гуртках і клубах народных рамёстваў,* характэрны наступныя прыкметы: прыналежнасць да трэцяга пакалення гараджан (тыя апытаныя, якія нарадзіліся ў горадзе і чые бацькі з'яўляюцца гараджанамі трэцяга пакалення); актыўнае засвойванне традыцыйнай культуры ў творчым працэсе на аснове міжасабовых зносін. Гэта сем'і, якія маюць дастаткова высокі ўзровень дасведчанасці ў розных жанрах народнай культуры і захоўваюць кампаненты сямейна-бытавой абраднасці ва ўкладзе жыцця не без уплыву фальклорна-этнаграфічных калектываў як крэатыўных носьбітаў этнічнай інфармацыі.

Бытаванне традыцыйных абрадаў і звычаяў прыметна пашыраецца, а дзякуючы пазітыўным адносінам да іх большасці гараджан яны актыўна засвойваюцца членамі сям'і, што дазваляе прыйсці да небеспадстаўных высноў аб жывучасці традыцый каляндарнай абраднасці, аб іх арганічнай уключанасці ў грамадскае, святочнае і штодзённае жыццё сям'і.

У параграфе 3.2 **«*Вясельныя, радзінныя абрады і абрады ўшанавання продкаў*»** разглядаюцца працэсы мадэрнізацыі сямейна-побытавых традыцый гарадской сям'і беларусаў.

Важнейшай прыкметай устойлівай дынамікі этнакультурных працэсаў у сям'і з'яўляецца захаванне цэласнасці этнакультурнага комплексу сямейна-бытавых абрадаў (вясельных, радзінных, абрадаў ушанавання продкаў).

*Этнакультурны комплекс* – гэта набор этнавызначальных культурных адзінак, у якім найбольш адметна выяўляюцца асаблівасці традыцыйнай сямейна-бытавой культуры і абраднасці беларусаў.

У выніку праведзенага суіскальнікам даследавання змяненняў у комплексе сямейна-бытавой абраднасці (вясельным, радзінным, абрадах ушанавання продкаў) у гарадах球 рознага тыпу зроблена выснова аб тым, што ў сучасных беларускіх гарадах створаны сапраўды спрыяльныя ўмовы для захавання і падтрымкі традыцыйнасці: асяроддзем шырокага бытавання і істотнага распаўсюджвання традыцыйных сямейна-бытавых абрадаў беларускага народа з'яўляюцца як буйныя, так і малыя, сярэднія гарады і г. Мінск.

Высветлена, што сем'і беларусаў валодаюць пэўнымі ведамі па трох асноўных складніках вясельнага абраду (давясельным, вясельным і

паслявясельным). У той жа час выяўлены і адрозненні ў глыбіні ведаў у залежнасці ад адукацыйнага ўзроўню рэспандэнтаў, іх сацыяльнага статусу, нацыянальнай прыналежнасці бацькоў, тыпу сям'і рэспандэнтаў, часу пражывання ў горадзе і тыпу горада.

Адзначана, што на вяселлях беларусаў усіх пакаленняў выкарыстоўваліся вясельныя абрады, звязаныя з галоўнай часткай абрадавага свята – самім вяселлем (застоллем). Пералік асобных элементаў усіх этапаў вяселля яскрава сведчыць аб веданні рэспандэнтамі працэдуры святкавання гэтай важнай падзеі практычна ва ўсіх падрабязнасцях і шматлікіх дэталях, незалежна ад тыпу горада і прыналежнасці да таго ці іншага пакалення гараджан. Аднак неабходна адзначыць, што найбольшая дасведчанасць рэспандэнтаў датычыць паслявясельных абрадаў.

Назвы абрадаў, іх вызначальныя элементы, вядомыя апытаным у іх лакальным значэнні, у кожным рэгіёне рэспублікі маюць свае асаблівасці. Сярод рэспандэнтаў, якія валодаюць грунтоўнымі ведамі па ўсіх трох складовых частках абраду, найбольш шматлікай з'яўляецца група жыхароў малых і сярэдніх гарадоў. Апытаныя з малых гарадоў паказалі высокі ўзровень дасведчанасці ў вясельнай абраднасці і яе выкарыстанні. Характэрнай рысай беларускага вяселля з'яўляецца наяўнасць аб'яднальных абрадавых падзей, такіх як сумесныя застоллі, адорванне маладых і іх сваякоў, падзел каравая. Менавіта ў абрадах праяўляецца пачуццё злучанасці маладой пары і яе родных, калектывізму сваякоў, сяброў і ўсіх запрошаных на ўрачыстасць, раскрываецца гасціннасць, сямейная талерантнасць і павага да выбару маладых (дачкі ці сына).

У ходзе даследавання атрыманы пераканаўчыя сведчанні таго, што пераемнасць традыцый даволі моцна захоўваецца ў сем'ях рэспандэнтаў, чые бацькі належаць да беларускай нацыянальнасці, аднак вясельная традыцыя добра падтрымліваецца і ў сем'ях апытаных, чые бацькі не з'яўляюцца беларусамі, што можна патлумачыць іх шчырым жаданнем пазнання беларускай культуры ва ўсіх яе праяўленнях.

Рэспандэнты, чые бацькі – беларусы па нацыянальнасці, валодаюць дастаткова грунтоўнымі ведамі па абрадах вясяльнага застолля, адорвання маладых, адорвання сваякоў маладых, падзелу каравая і ўсё больш упэўнена і паслядоўна ўжываюць гэтыя кампаненты абраду ў правядзенні асабістых сямейных урачыстасцей. Абрады першай і другой часткі вяселля найбольш вядомы і выкарыстоўваюцца ў сем'ях пашыранага складу і нуклеарных сем'ях, а прыхільнасць да абавязковага правядзення паслявясельных абрадаў характэрна для прадстаўнікоў нуклеарных сем'яў.

У дачыненні да студэнцкіх сем'яў адзначана актыўнае выкарыстанне вясельных абрадаў, асабліва абрадаў першай часткі – давясельных; такая сацыяльныя група, як рабочыя, таксама паказала даволі значную дасведчанасць адносна традыцыйнага беларускага вяселля. Па выніках апытання высветлена, што ўзровень адукацыі карэнным чынам не ўплывае на выкарыстанне кампанентаў традыцыйнага вяселля ў сям'і.

Такім чынам, вясельны абрад беражліва захоўваецца ў сем'ях розных тыпаў, а шырокае яго бытаванне як у малых, так і ў сярэдніх і буйных гарадах красамоўна

сведчыць аб тым, што беларусы вераць у сілу традыцыі і лічаць абавязковае выкананне вясельных абрадаў не проста данінай модзе, але залогам будучых ладу і згоды ў сям'і.

У радзінных абрадах сучаснымі сем'ямі беларусаў захоўваецца дастаткова значная колькасць элементаў традыцыйнай абраднасці: большасць апытаных бацькоў, незалежна ад месца і часу пражывання ў горадзе, захоўваюць абрад хрышчэння дзяцей у храме.

Вялікая колькасць апытаных бацькоў станоўча ставяцца да існавання інстытута хросных бацькоў (традыцыя бытуе ў сярэдніх, буйных гарадах, у г. Мінску, у малых гарадах; у тых сем'ях рэспандэнтаў, у якіх адзін з бацькоў належыць да беларускай нацыянальнасці; найбольш захавана ва ўскладненых сем'ях; трывала падтрымліваецца ў тых сем'ях, якія жывуць у горадзе ў першым пакаленні).

Пераважная большасць апытаных бацькоў высока цэняць ролю хросных бацькоў у сацыялізацыі дзяцей і далучэнні іх да вопыту папярэдніх пакаленняў і свайго роду (гэта слушнае меркаванне аб пазітыўнай сутнасці традыцыі выказалі жыхары сярэдніх гарадоў рэспублікі; прадстаўнікі ўскладненых сем'яў; апытаныя, якія жывуць у горадзе ў другім пакаленні.

Традыцыі ўшаванавання продкаў захаваліся сучаснымі гараджанамі ў галоўных элементах – большасць гараджан наведваюць могілкі памерлых па рэлігійных святах, даглядаюць іх, распавядаюць аб жыцці продкаў сваім дзецям і ўнукам. У абраднасці малых і буйных гарадоў кампаненты «догляд могілак» і «наведванне могілак па вызначаных датах» пераважаюць у параўнанні з іншымі, што тлумачыцца захаваннем больш выразнай лакальнай традыцыі.

У абрадзе ўшанавання продкаў захаваны ўсе структурныя элементы. Прычым яны добра вядомы як рэспандэнтам, чые бацькі належаць да беларускай нацыянальнасці, так і не беларусам, што садзейнічае распаўсюджванню традыцыйнай абраднасці. Элементы пахавальных абрадаў, якія датычаць наведвання могілак па асаблівых днях: на Дзяды, Радаўніцу, у гадавіну смерці захаваны ў абраднасці беларусаў, якія з'яўляюцца гараджанамі ў другім пакаленні; догляд могілак блізкіх людзей, памінанне памерлых у храме ўкаранёны ў побыце беларусаў – гараджан у трэцім і чацвёртым пакаленнях. Найбольш захоўваюцца традыцыі памінання ва ўскладненых сем'ях, што тлумачыцца больш цеснымі сувязямі з прадстаўнікамі некалькіх пакаленняў.

Калі параўноўваць радзінныя і пахавальныя абрады з вясельнымі, то трэба сказаць, што першыя захаваліся ў сваім традыцыйным выглядзе, у той час як у вясельную абраднасць арганічна ўключаны элементы інавацый.

У параграфе 3.3 ***«Традыцыі роднасна-сваяцкіх адносін»*** даследуюцца традыцыі міжпакаленных адносін. Вызначана і абгрунтавана палажэнне аб тым, што пераемнасць традыцый у сферы сямейных, роднасна-сваяцкіх адносін у сучаснай сям'і беларусаў адбываецца ў межах постфігуратыўнай і кафігуратыўнай культур (М. Мід), калі мадэлі жыцця бацькоў з'яўляюцца ўзорам для перайманння (асабліва ў постфігуратыўных грамадствах). Аднак высветлена, што ў сямейны побыт паступова ўкараняюцца рысы новага тыпу культуры – прэфігуратыўнай,

якая характарызуецца фарміраваннем мадэлі жыцця дзяцей без апоры на прыклады жыццёвага ўкладу папярэдніх пакаленняў.

Аб'ектам аналізу, у ходзе якога выяўлены істотныя падставы для дадзенага вываду, з'яўляліся мадэль жыцця бацькоў апытаных рэспандэнтаў і бытаванне традыцый аказання матэрыяльнай і маральнай дапамогі і падтрымкі бацькамі сваіх дзецей і, адпаведна, дзецьмі – бацькоў. Даследаванне адносін да тых ці іншых мадэлей жыцця бацькоў апытаных, праведзенае па розных крытэрыях: узросце апытаных, іх адукацыі, прыналежнасці да пэўнай сацыяльнай групы, тыпу сям'і, нацыянальнасці бацькоў і месцы жыхарства, паказала, што прадстаўнікі старэйшых узроставых груп хацелі б, каб дзеці паўтарылі іх мадэль жыцця, аднак сем'і маладзейшых узроставых груп у сучасных умовах ужо не могуць поўнасцю трансліраваць бацькоўскую мадэль жыцця; рэспандэнты з вышэйшай адукацыяй пазітыўна ставяцца да жыцця іх бацькоў; апытаныя з няпоўных сем'яў даволі часта выказваюць упэўненасць у тым, што іх бацькі лепшыя за іншых; рэспандэнты, бацькі якіх не беларускай нацыянальнасці, больш паддаюцца ўплыву на фарміраванне іх уяўленняў аб мадэлях сямейнага жыцця; апытаныя з буйных гарадоў выказваюць больш пазітыўныя адносіны да мадэлі жыцця іх бацькоў, чым рэспандэнты з іншых гарадоў.

Студэнцкія сем'і ў параўнанні з іншымі сацыяльнымі групамі больш прыхільна ставяцца да бацькоў, яны лічаць, што бацькоўская мадэль адносін да іх – добры ўзор для пераймання. Сувязі паміж маладымі студэнцкімі сем'ямі і бацькамі асабліва моцна праяўляюцца ў складаныя перыяды іх жыцця (у час хваробы, напружанай вучобы, працоўнай занятасці маладых бацькоў).

Сучаснай гарадской сям'ёй беларусаў захоўваюцца наступныя віды матэрыяльнай дапамогі і маральнай падтрымкі: рэгулярная грашовая дапамога, грашовая дапамога час ад часу, дапамога ў вядзенні хатняй гаспадаркі, дапамога па доглядзе і выхаванні дзяцей, догляд у выпадку хваробы, маральныя парады і настаўленні і інш.

Шырока распаўсюджанай мадэллю аказання матэрыяльнай дапамогі ў цяперашні час з'яўляецца наступная: бацькі матэрыяльна (грашова) падтрымліваюць дзяцей (па меры неабходнасці або пастаянна), а дзеці, у сваю чаргу, дапамагаюць бацькам у час іх хвароб і (больш ці менш рэгулярна) па хатняй гаспадарцы. Па выніках даследавання зафіксавана і прыхільнасць бацькоў да мадэлі аказання матэрыяльнай дапамогі дзецям час ад часу, а дзяцей – да мадэлі аказання маральнай дапамогі і парад. Вызначэнне дадзенай мадэлі ўзаемаадносін паміж бацькамі і дзецьмі – сведчанне працягу традыцый, якая існавала ў міжпакаленных адносінах і ў ранейшыя часы.

Шырокі дыяпазон крытэрыяў для аналізу бытавання мадэлей аказання матэрыяльнай дапамогі і маральнай падтрымкі дазваляе комплексна ацаніць праблему і прыйсці да высновы: матэрыяльная дапамога ад бацькоў амаль не патрабуецца ва ўскладненых семя'х, у той час як у няпоўных сем'ях яна з'яўляецца неабходнай; для жыхароў Мінска падтрымка бацькоў – не істотная, а вось для жыхароў малых гарадоў – надзвычай адчувальная. Жыхары малых гарадоў дапамагаюць сваім бацькам па гаспадарцы, што з'яўляецца адметным праяўленнем

паважліва-клапатлівых адносін, а жыхары сярэдніх гарадоў больш значна аказваюць маральную падтрымку; мінчане дапамагаюць бацькам матэрыяльна больш, чым жыхары іншых гарадоў.

Відавочна, што сем'і пашыранага складу больш устойлівыя ў матэрыяльным забеспячэнні, чым сем'і няпоўныя, якім патрабуецца значная матэрыяльная дапамога. Сем'ям, якія пражываюць у вялікіх гарадах, амаль не патрабуецца бацькоўская дапамога. Жыхары малых гарадоў працягваюць традыцыю дапамогі бацькам, якую традыцыйна лічаць сродкам выканання сыноўскага (даччынага) абавязку, сродкам выказвання павагі да старэйшага пакалення.

У параграфе 3.4 ***«Традыцыі выхавання і этыкету»*** прыводзіцца аналіз бытавання традыцый і звычаяў, ацэньваецца ўзровень іх захавання.

Высветлена, што сучасная гарадская сям'я беларусаў прытрымліваецца некаторых народных традыцый у выхаванні дзяцей. Пры гэтым перавага надаецца выхаванню праз працу, навучанню канкрэтнаму віду дзейнасці, важкая роля адводзіцца метадам суправаджэння і падтрымкі дзяцей, якія адносяцца да метадаў маральных узаемадзеянняў бацькоў і дзяцей і карэкціроўкі паводзін дзяцей.

Трывожнай тэндэнцыяй для сённяшняй сям'і з'яўляецца выкарыстанне пакаральных метадаў выхавання. Існаванне такіх метадаў у няпоўных сем'ях – асабліва небяспечная тэндэнцыя. Даследаванне паказала, што метад фізічнага ці маральнага пакарання бытуе сярод жыхароў сярэдніх гарадоў, у той час як пераважнай большасцю мінскіх сем'яў такі метад не выкарыстоўваецца. Заўважана, што для прадстаўнікоў чацвёртага пакалення гараджан рэспублікі характэрны метады маральнай падтрымкі і апекі, а сямейных гараджан першага пакалення можна назваць бацькамі-гуманістамі, бо яны амаль ніколі не прымяняюць уціску адносна сваіх дзяцей. Для служачых, ваеннаслужачых, студэнтаў і пенсіянераў найбольш характэрны традыцыі народнага выхавання, такія як далучэнне да працы з маленства, заахвочванне да рамёстваў, уласны прыклад, метады карэкціроўкі паводзін.

Узровень адукацыі не аказвае ўплыву на прытрымліванне тых ці іншых метадаў, прыёмаў і сродкаў народнага выхавання: рэспандэнты з незавершанай адукацыяй паказалі дастаткова высокі ўзровень дасведчанасці аб найбольш дзейсных і пазітыўных метадах выхавання і іх карысці.

Значнае месца ў выхаванні дзяцей належыць фальклору, што асабліва характэрна для малых сем'яў, у якіх колькасць выхавальнікаў абмежавана. Гэты вынік з'яўляецца добрай падставай для развіцця такога напрамку працы з сем'ямі ў пазашкольнай сферы, як арганізацыя бацькоўскіх і сямейных клубаў ва ўстановах культуры. Найбольшую жыццяздольнасць і ўстойлівасць традыцыі народнага выхавання маюць у пашыраных сем'ях, у сем'ях, якія жывуць у малых гарадах рэспублікі, а таксама ў сем'ях, дзе бацькі рэспандэнтаў (ці хаця б адзін з бацькоў) – беларусы па нацыянальнасці.

Народны этыкет – частка духоўнай культуры народа, яго роля ў выхаванні дзяцей выключная: нормы этыкету ўтрымліваюць характэрныя асаблівасці менталітэту беларусаў, яго ўяўленняў і каштоўнасных арыентацый. Апытанне рэспандэнтаў паказала, што у сучаснай сямейнай этыкетнай культуры захоўваюцца

традыцыі паважлівых адносін да старэйшых, перш за ўсё бацькоў, выконваюцца правілы гасціннасці.

У главе 4 **«Сацыяльна-педагагічны і выхаваўчы патэнцыял традыцый беларусаў як крыніца развіцця сучаснай гарадской сям'і»** разглядаецца практычны вопыт дзейнасці сістэмы адукацыі і ўстаноў сацыякультурнай сферы і выяўляецца роля вышэйшай школы ў рабоце з моладдзю.

У параграфе 4.1 ***«Рэалізацыя патэнцыялу нацыянальных традыцый беларусаў у працы з сям'ёй»*** указваецца, што на ўсіх ступенях адукацыі – дашкольнай, школьнай, пазашкольнай, вышэйшай і паслядыпломнай, назапашана вялікая колькасць разнастайных напрамкаў працы, якія спрыяюць працэсам сацыялізацыі і выхаванню сучасных пакаленняў беларусаў на аснове ідэалаў беларускага народа. Створаны новыя напрамкі дзейнасці ўстаноў сацыякультурнай сферы: у дамах народнай творчасці і рамёстваў сфарміравана сістэма працы па адраджэнні народных промыслаў, шырокае развіццё атрымліваюць аматарскія аб'яднанні, сямейныя самадзейныя калектывы. Мэты адукацыйных і сацыякультурных устаноў накіраваны на стварэнне культурна-інтэлектуальнага асяроддзя, заснаванага на гісторыка-культурных традыцыях, на выхаванне асобы сродкамі нацыянальнай культуры.

Аматарскія клубы традыцыйнай народнай культуры аб'ядноўваюць майстроў у розных жанрах народнага мастацтва, з'яўляюцца цэнтрамі прапаганды лепшых традыцый нацыянальнай культуры. Па ўсёй краіне працуюць клубы народных майстроў – «Пралеска» ў Стоўбцах, «Фантазія» ў Слуцку, «Майстар» у Маладзечна, «Майстры Ігуменьшчыны» ў Чэрвені, «Скарбніца» ў Валожыне, «Скарб зямлі Лагойскай» у Лагойску і інш. Клубы народных майстроў – сапраўдныя цэнтры культуры і прапаганды лепшага вопыту народнай традыцыйнай культуры. Далучэнне да іх дзейнасці сям'і, дзяцей і моладзі – адна з мэт аб'яднанняў, скіраваных на фарміраванне высокамастацкага густу, эстэтычнага ўзроўню, культурнага кругагляда сямейнага насельніцтва.

Значным напрамкам работы па папулярызацыі і распаўсюджванні традыцыйнай культуры Беларусі з'яўляецца фестывальны рух. Яскравым прыкладам такой працы з'яўляецца фестываль «Берагіня», месцам яго правядзення нязменна з'яўляецца г. п. Акцябрскі Гомельскай вобласці. Фестываль – гэта вялікае адукацыйна-асветніцкае мерапрыемства, у рамках якога традыцыйна адбываюцца навукова-практычныя канферэнцыі, прысвечаныя праблеме захавання традыцый пераемнасці, перадачы іх ад пакалення да пакалення, у спадчыну дзецям.

Падзеяй рэспубліканскага ўзроўню становяцца фестывалі сямейнай творчасці, апошні з якіх быў праведзены ў Слоніме ў 2007 годзе. Мэта фестывалю – папулярызацыя традыцый аматарскай мастацкай творчасці, павышэнне мастацкага ўзроўню і выканальніцкага майстэрства сямейных калектываў, узбагачэнне іх рэпертуару, распаўсюджванне новых форм сямейнага побыту, пераемнасці нацыянальных сямейных традыцый і абрадаў.

Своеасаблівае аблічча набываюць гарады рэспублікі ў час падрыхтоўкі да фестываляў, святаў песні, музыкі, працы, якія ладзяцца з нагоды юбілеяў, памятных дат. Заслуговае ўвагі традыцыя святкавання рэспубліканскага

фестывалю-кірмашу працаўнікоў вёскі «Дажынкі», якая з’яўляецца не толькі рэканструкцыяй традыцыйнага каляндарнага свята, але і акцыяй дзяржаўнай кансалідацыі сельскіх працаўнікоў з жыхарамі ўсёй краіны. Усё гэта спрыяе фарміраванню годнай асобы, усведамленню маладымі пакаленнямі значнасці і каштоўнасці ідэалаў беларускага народа – любові да Айчыны, патрыятызму, працавітасці, згоды і салідарнасці.

У краіне наладжаны новы напрамак працы з дзецьмі, моладдзю і сем’ямі – сацыяльна-педагагічная дапамога і суправаджэнне на тых жыццёвых этапах, калі неабходна асаблівая ўвага да пытанняў развіцця чалавека, станаўлення яго як асобы. Роля нацыянальнай культуры ў рэалізацыі гэтай дзейнасці выключная: яна з’яўляецца найбольш натуральным і арганічным сродкам уздзеяння на асобу, дапамагае без уціску ўплываць на фарміраванне асобы.

Падрыхтоўкай маладых людзей да сямейнага жыцця, працай з маладымі сем’ямі займаюцца і рэлігійныя ўстановы краіны, якія захоўваць духоўную спадчыну беларускага народа, яго хрысціянскія каштоўнасці. У рэспубліцы створана сістэма працы з дзецьмі і іх бацькамі ў рамках нядзельных школ, што спрыяе фарміраванню станоўчых поглядаў на сям’ю, бацькоўства, дзяцей.

Асобая роля адводзіцца вышэйшай школе як інстытуту сацыялізацыі студэнцкай моладзі, інстытуту па падрыхтоўцы сацыяльна кампетэнтнай асобы. Гэты напрамак працы раней ніколі не быў у цэнтры ўвагі вышэйшай адукацыі. На сённяшнім этапе сфарміраваны сацыяльны запыт да вышэйшай школы як установы, якая павінна быць не толькі цэнтрам падрыхтоўкі інтэлектуальнай эліты краіны, але і асяроддзем, дзе ідэалы нацыянальнай культуры, павага да нацыянальнай спадчыны з’яўляюцца вызначальнымі ў развіцці асобы.

У параграфе 4.2 ***«Фарміраванне адносін моладзі да сям’і ў вышэйшай школе»*** указваецца, што адной з важнейшых мэт вышэйшай школы з’яўляецца сацыяльнае выхаванне моладзі. Вышэйшая школа сёння здольна фарміраваць каштоўнасныя адносіны моладзі да сям’і як наймацнейшага падмурку асабістага і грамадскага жыцця. У ёй можа быць створана грунтоўная навукова-метадычная сістэма падрыхтоўкі моладзі да ўступлення ў шлюб, заснаваная на багатых традыцыях нацыянальнай культуры. У кожнай вышэйшай установе рэспублікі назапашаны значны вопыт працы ў гэтым напрамку, аднак на сучасным этапе яго неабходна перагледзець, аднавіць лепшыя традыцыі. Асабліва сацыяльна значная і карысная работа можа праводзіцца гуманітарнымі ВНУ, у прыватнасці ВНУ педагагічнага і сацыяльна-педагагічнага профілю.

Вартая ўвагі работа з моладдзю ў Беларускім дзяржаўным універсітэце фізічнай культуры, Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, Гродзенскім дзяржаўным аграрным універсітэце, Горацкай аграрнай акадэміі, Полацкім дзяржаўным універсітэце, Беларускім дзяржаўным універсітэце і інш. У названых установах прафесарска-выкладчыцкія калектывы і спецыялісты зацікаўлена ставяцца да сямейнай праблематыкі, выкарыстоўваючы ў рабоце са студэнтамі магчымасці не толькі вучэбнага працэсу, але і пазавучэбную дзейнасць. Вопыт арганізацыі вучэбнай, сацыяльнай і выхаваўчай работы з моладдзю ў вышэйшай школе краіны паказвае, што ў маладзёжным асяроддзі сфарміраваўся запыт на гэты від дзейнасці:

узрасло разуменне каштоўнасцей сям'і і шлюбу для асабістага жыцця, яго цеснай сувязі з прафесійным прызначэннем і кар'ерным поспехам. Аднак гэта ўсведамленне мае вельмі нетрывалую аснову, таму патрэбна прыкласці шмат намаганняў, каб дасягнуць пастаўленых мэт у працы з дашлюбнай моладдзю.

Павышэнне культуры сямейных адносін у бацькоўскай сям'і, узвышэнне сацыяльнай значнасці бацькоўскіх роляў, роляў прафесіяналаў як сямейных людзей – важнейшы напрамак дзяржаўнай сямейнай маладзёжнай палітыкі, якая ажыццяўляецца вышэйшай школай таксама. Стварэнне кадравай структуры ў сістэме вышэйшай школы, якая забяспечвае работу з моладдзю, – неабходная ўмова прасоўвання ідэй сістэмнай падрыхтоўкі моладзі да сямейнага жыцця і плённай работы з маладымі сем'ямі.

На сучасным этапе мэтанакіраваная перападрыхтоўка спецыялістаў па рабоце з моладдзю наладжана ў вучэбным працэсе Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы (РІВШ). У прафесійныя кампетэнцыі прафесарска-выкладчыцкага калектыву ўваходзяць пытанні працы з моладдзю. Адкрыццё перападрыхтоўкі – канкрэтны крок у вырашэнні кадравай праблемы, значнасць якой выразна акрэслена ў рэспубліканскіх праграмах «Моладзь Беларусі», «Маладыя таленты Беларусі», «Дзеці Беларусі» і Нацыянальнай праграме дэмаграфічнай бяспекі Рэспублікі Беларусь.

Спецыялісты па рабоце з моладдзю – будучыя кіраўнікі маладзёжных праграм і праектаў, лідэры маладзёжных арганізацый і грамадскіх рухаў, падрыхтоўка якіх пачалася ў рэспубліцы, – гэта спецыялісты новага пакалення, здольныя забяспечыць высокі навукова-метадычны ўзровень работы з моладдзю, сфарміраваць каштоўнасныя ўстаноўкі на стварэнне сям'і, падтрымаць маладыя сем'і. Шэраг аўтарскіх праграм, укаранёных у сістэму паслядыпломнай адукацыі на базе Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы на працягу 2004–2009 гг., паказваюць, што слухачамі станоўча ацэнена ініцыятыва па адраджэнні такога напрамку дзейнасці.

Адным з прыярытэтных кірункаў работы з'яўляецца полікультурная адукацыя, атрыманне моладдзю навыкаў міжкультурных зносін. Дадзены напрамак – новы погляд на ўмацаванне традыцыйных каштоўнасцей і нацыянальнай ідэнтычнасці. Мэтавыя курсы, укаранёныя ў РІВШ, паказваюць, што полікультурная граматнасць – актуальны складнік адукацыі: моладзь, якая сёння актыўна ўключана ў міжкультурныя кантакты, павінна не толькі мець прафесійную падрыхтоўку належнага ўзроўню, але і ў поўнай меры валодаць кампетэнцыямі ў міжкультурных і міжнацыянальных зносінах, што дазволіць ёй захаваць нацыянальную ідэнтычнасць ва ўмовах сучаснага шматнацыянальнага соцыуму горада.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

## Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

1. Этнакультурныя працэсы выяўляюць важнейшыя тэндэнцыі развіцця этнічнай гісторыі беларускага народа, сям'і як асновы захавання нацыянальных традыцый. Даследаванне этнакультурных працэсаў у сям'і – істотны напрамак у развіцці беларускай этналагічнай навукі, прыярытэтная задача, якая скіравана на забеспячэнне эфектыўнай сацыяльнай палітыкі ў краіне. Новы тэарэтыка-метадалагічны падыход да даследавання этнакультурных працэсаў у гарадской сям'і беларусаў у апошняй трэці XX – пачатку XXI ст. уяўляе комплекс канцэптуальных палажэнняў тэорый эвалюцыянізму, мадэрнізацыі, каштоўнасцей і полікультурнасці.

Выбар пералічаных тэорый абгрунтаваны і значны для дадзенага даследавання з пазіцыі грамадскіх, сацыяльна-эканамічных і культурных задач, якія вырашаліся ў краіне ў перыяд 70–80-х гадоў XX ст.; у 80–90-я гады XX ст. і ў перыяд з 1991 г. да цяперашняга часу. У 70–80-я гады XX ст. сям'я як ячэйка савецкага грамадства вывучалася ў кантэксце эвалюцыйнай тэорыі. Асноўныя палажэнні тэорыі сцвярджаюць, што сям'я з'яўляецца носьбітам традыцый, сацыяльна значным інстытутам, які забяспечвае механізм прагрэсу ў грамадстве. Аднак, разам з тым, у працэсе грамадскіх змен функцыі сям'і таксама змяняюцца – сям'я выконвае то пасіўную, то актыўную ролю. Яна то падпарадкоўваецца грамадскім працэсам, то сама ўплывае на іх стан і дынаміку. У адзначаны перыяд грамадскія трансфармацыі аказалі дзейсны ўплыў на сям'ю, што закранула яе стан, характар сямейных і міжсямейных адносін.

Атрыманне рэспублікай статусу незалежнай і самастойнай краіны аказала істотнае ўздзеянне на працяканне этнакультурных працэсаў у 80–90-я гады XX ст. Для даследавання гэтых працэсаў былі абраны вядучыя ідэі тэорыі мадэрнізацыі. У рамках тэорыі былі разгледжаны важнейшыя пытанні жыццядзейнасці сям'і ва ўмовах посттрадыцыйных і мадэрнізаваных грамадстваў – гэта пытанні змянення ўкладу жыцця і фарміравання новай каштоўнаснай парадыгмы. Змяненні, асабліва ў сацыяльна-эканамічным развіцці грамадства, інфарматызацыя ўсіх сфер жыцця аказваюць дзейсны ўплыў на асобу, яе ўнутраны свет. Сям'я як самая значная крыніца сацыялізацыі ў традыцыйных грамадствах, у мадэрнізаваных грамадствах страчвае сваю функцыю, з аднаго боку, а з другога, – выпрацоўвае адноўлены механізм жыццядзейнасці, у аснове якога ляжаць і традыцыі, і інавацыі.

Транфармацыі канца XX ст. закранулі шэраг пытанняў развіцця этнасаў: у навуковым асяроддзі быў сфармуляваны абноўлены навуковы погляд на сутнасць этнічных працэсаў, ролю нацыянальнай культуры, ступень мадэрнізаванасці традыцый. Акрэслены новыя тэндэнцыі ў развіцці этнасу, вызначана значэнне этнічнасці як устойлівай прыкметы функцыянавання грамадскіх працэсаў, у тым ліку і ў сям'і.

Палажэнні тэорый каштоўнасцей і полікультурнасці былі пакладзены ў аснову тлумачэння этнакультурных працэсаў, якія адбываліся ў перыяд 90-х гадоў

XX ст. і адбываюцца да цяперашняга часу. Каштоўнасці – гэта стрыжань фарміравання асобы, а сямейныя традыцыі – стрыжань фарміравання духоўных ідэалаў чалавека, яго светапогляду.

Напрамкі працякання этнакультурных працэсаў у сям'і беларусаў на сучасным этапе фарміруюцца ў гарадскім асяроддзі: менавіта гарадскія сем'і колькасна пераважаюць сельскія. Таму фактары, характэрныя для гарадскога соцыуму, такія як полікультурнасць і поліэтнічнасць, з'яўляюцца выключна важнымі – сфера сямейна-бытавых адносін становіцца інтэрнацыянальнай, а сістэма каштоўнасцей – шматнацыянальнай. Захоўваюцца важнейшыя для беларускай сям'і каштоўнасці калектывізму, узаемнай выручкі, падтрымкі, згоды, талерантных адносін, павагі да нацыянальнай культуры і традыцый. У сямейны быт і этыку сямейных адносін уваходзяць новыя арыентацыі, такія як індывідуалізм, эгацэнтрызм, прагматызм, рацыянальналізм і інш. Гэтыя новыя з'явы спрыяюць фарміраванню новага тыпу пераемнасці традыцый, абноўленага механізму адносін паміж сем'ямі, родамі, пакаленнямі, што адбіваецца на ідэалах, светаўспрыманні маладых пакаленняў.

Такім чынам, рэпрадуктаванне этнакультурных працэсаў у сям'і адбываецца ў сітуацыі суіснавання традыцый і інавацый, захаванасці каштоўнасцей калектывізму і пранікненні каштоўнасцей індывідуалізму. Такое становішча з'яўляецца своеасаблівым пераходным этапам у функцыянаванні этнакультурных працэсаў у сям'і [1, с. 36–58; 7; 11, с. 101–106; 14, с. 23–26].

2. Сінтэз вядучых палажэнняў тэорый эвалюцыянізму, мадэрнізацыі, каштоўнасцей і полікультурнасці ў вывучэнні этнакультурных працэсаў у сям'і, даследаванне гістарыяграфіі праблемы дазволіла вылучыць асноўныя перыяды дынамікі этнакультурных працэсаў і даць ім характарыстыку: 1) 70-80-я гг. XX ст. (прыярытэт каштоўнасцей савецкай сістэмы); 2) 80-90-я гг. XX ст. (аслабленне ідэалагічнага ўздзеяннння каштоўнасцей савецкай сістэмы, захаванне пераемнасці і адраджэнне нацыянальных традыцый); 3) 1991г.– пачатак XXI ст. (узмацненне ролі нацыянальных традыцый у функцыянаванні сям'і, у яе грамадскім і сацыяльна-культурным жыцці).

Кожны з вызначаных перыядаў характарызуецца пэўнымі адметнасцямі. У 70-80-я гг. XX ст. прыярытэтнымі ў функцыянаванні сям'і былі каштоўнасці савецкага ўкладу жыцця, калі мэты пабудовы камунізма аб'ядноўвалі людзей. Этнакультурныя працэсы працякалі згодна гэтых кірункаў. Сямейна-шлюбныя адносіны, структура сям'і, яе функцыі і тыпалогія адпавядалі нарматыўным прынцыпам, якія існавалі ў грамадстве. Сямейна-бытавыя традыцыі і абрады беларусаў такіх як радзінныя і вясельныя, абрады ўшанавання продкаў, роднасна-сваяцкія стасункі, народныя святы складалі сямейны ўклад жыцця, аднак, іх бытаванне не выходзіла за межы ўнутрысямейнага і міжсямейнага ўзроўняў.

У 80-90-я гг. XX ст. назіраліся працэсы адраджэння нацыянальнай сістэмы каштоўнасцей, абуджэнне цікавасці да матэрыяльнай, духоўнай і сацыяльнай культуры беларускага народа, што было звязана перш за ўсё з карэннымі зменамі, якія адбыліся ў грамадстве – распадам савецкай дзяржавы і стварэннем самастойнай незалежнай Рэспублікі Беларусь. На стан этнакультурных працэсаў

аказвалі ўплыў праблемы сацыяльна неабароненых сем'яў (сем'яў групы рызыкі, сем'яў з непаўналетнімі дзецьмі, няпоўных і шматдзетных сем'яў), якія паўсталі перад дзяржавай вельмі востра і вырашэнне якіх патрабавала неадкладных мер.

Нягледзечы на істотныя праблемы гэтага перыяду, нацыянальная культура і яе традыцыі, што адраджаліся ў незалежнай беларускай дзяржаве, з'яўляліся асновай функцыянавання сям'і, яе базавых патрэбнасцей.

У перыяд з 1991 г. і да сёння выразнай асаблівасцю ў функцыянаванні сям'і становіцца ўзмацненне ролі нацыянальных традыцый. Тыповымі прыметамі этнакультурных працэсаў у сям'і гараджан становяцца новыя з'явы ў шлюбна-сямейных адносінах, адначасовае існаванне традыцый і інавацый у сямейна-бытавой абраднасці, звяртанне да царкоўных абрадаў, адраджэнне цікавасці да фальклорна-этнаграфічнай спадчыны, мовы, да архітэктурных помнікаў беларускага народа. Умацоўваецца ў свядомасці сучасных пакаленняў каштоўнасць шлюбу як трывалай формы сямейных адносін, адбываецца ўзвышэнне бацькоўства як сацыяльнай і грамадскай каштоўнасці [1, с. 36–58; 4, С.47–54; 9, с. 294–305].

3. Беларусь – краіна, якая развіваецца вельмі дынамічна і інавацыйна, што адбіваецца на стане сям'і, яе ідэалах і каштоўнасцях і адлюстроўваецца ў фарміраванні сістэмы абраднасці, якая захоўвае ўсё лепшае, што было назапашана мінулымі пакаленнямі і «нараджае» новае. Важнай рысай сучаснага этапа жыцця з'яўляецца распаўсюджанасць новых тэхнічных (камп'ютэрных) сродкаў камунікацый. Іх укараненне ў штодзённае жыццё сям'і адбываецца праз прадстаўнікоў маладзейшых пакаленняў, якія з'яўляюцца носьбітамі новых нарматыўных адносін. Новы ўзровень грамадскага развіцця аказвае даволі адчувальны ўплыў на фарміраванне новых правіл маралі і этыкету ў сям'і, на характар этнакультурных працэсаў. На працяканне этнакультурных працэсаў у сучаснай сям'і непасрэдна ўплывае і ўклад жыцця, што адбіваецца на з'яўленні новых форм сям'і і шлюбу, трансфармацыі яе структуры і шлюбна-сямейных адносін, на функцыях, тыпалогіі, складзе.

Распаўсюджаным тыпам сям'і з'яўляецца нуклеарная (малая) сям'я, у якой жывуць бацькі і іх дзеці (двухпакаленныя сем'і). Менш распасюджаным тыпам з'яўляюцца пашыраныя ці ўскладненыя (трохпакаленныя). Частку сем'яў складаюць няпоўныя сем'і, у якіх пражываюць ці бацька, ці маці з дзецьмі; пазашлюбныя сем'і, у якіх пражываюць, як правіла, маці з дзіцем, народжаным па-за афіцыйна прызнаным шлюбам; сем'і ў паўторным шлюбе; маладыя сем'і; бяздзетныя сем'і.

Важным крытэрыем ацэнкі развіцця сям'і з'яўляецца дзетнасць (або колькасць дзяцей у сям'і). Выдзяляюцца тры тыпы сем'яў: маладзетныя, шматдзетныя, сярэднядзетныя. Маладзетныя характарызуюцца наяўнасцю аднаго-двух дзяцей; сярэднядзетныя – трох-чатырох; шматдзетныя – маюць пяць і больш дзяцей. Характэрнай асаблівасцю традыцыйнай сям'і беларусаў з'яўлялася шматдзетнасць, у рамках якой забяспечвалася больш устойлівая традыцыя міжпакаленных сувязей і перадачы этнічных ведаў, у той час як сучаснай сям'і беларусаў уласціва маладзетнасць, што перашкаджае забеспячэнню пэўнага

ўзроўню міжпакаленнай перадачы ведаў, паколькі па меры змяншэння колькасці членаў сям'і непазбежна адбываецца аслабленне традыцый міжпакаленных сувязей.

На сучасным этапе адной з важнейшых задач дэмаграфічнай палітыкі з'яўляецца павелічэнне колькасці дзяцей у сям'і і падтрымка шматдзетных сем'ў.

Характэрнымі функцыямі сям'і з'яўляюцца спецыфічныя функцыі – рэпрадукцыйная (нараджэнне дзяцей), экзістэнцыяльная (забеспячэнне дзяцей), сацыялізацыі (выхаваўчая). На даным этапе набываюць дастатковую ўстойлівасць і бытаванне і неспецыфічныя функцыі. Сярод іх вызначаюцца назапашванне і перадача ў спадчыну маёмасці, забеспячэнне станоўчага псіхалагічнага мікраклімату, функцыя камунікацый і сацыяльных зносін і інш.

Асновы дзяржаўнай сямейнай палітыкі, якія былі сфарміраваны яшчэ ў 90-я гады XX ст. паспрыялі паляпшэнню становішча дзяцей, прадухіленню негатыўных з'яў, якія былі выяўлены ў функцыянаванні сям'і ў к. XX стагоддзя. Намаганні, якія былі прыкладзены па паляпшэнню сацыяльна-эканамічнага становішча сям'і, умацаванню яе грамадскага статуса, сталі мець добрыя вынікі: узрасла колькасць сямейных пар, павысілася нараджальнасць. У краіне створана сістэма працы з сацыяльна неабароненымі сем'ямі, сем'ямі групы рызыкі, сем'ямі з непаўналетнімі дзецьмі, шматдзетнымі і няпоўнымі сем'ямі. Дзякуючы мэтанакіраванай дзяржаўнай палітыцы, значныя змяненні адбыліся ў вырашэнні праблемы сацыяльнага сіроцтва.

Стан шлюбна-сямейных адносін гараджан выяўляе характар і дынаміку этнакультурных змяненняў. Значна перапрацаваны і дапоўнены новымі артыкуламі заканадаўчыя дакументы аб шлюбе і сям'і. Асноўны юрыдычны дакумент – Кодэкс аб шлюбе і сям'і, які дзейнічаў у 60–90-я гады XX ст., адноўлены, створаны новы кодэкс. У адрозненне ад дакумента 1960–1990-х гадоў новая рэдакцыя кодэкса ўтрымлівае артыкулы, у якіх замацавана палажэнне аб тым, што сям'я – гэта натуральнае асяроддзе пражывання чалавека, найбольш спрыяльны інстытут узгадоўвання дзяцей, таму выхаванне дзяцей у сям'і абараняецца і падтрымліваецца дзяржавай. Удасканальванне заканадаўчай базы дазволіла замацаваць ролю сям'і як сацыяльна значнага інстытута ў беларускім грамадстве.

Удасканальваецца маральна-прававая культура сям'і праз шлюбную дамову (кантракт). Шлюбны кантракт як новая форма рэгулявання сямейных адносін становіцца фактарам павышэння прававой граматнасці і сямейнай культуры. Вынікі этнасацыялагічнага даследавання 2007 г. паказваюць, што чым больш адукаваныя і маладыя рэспандэнты, тым больш яны карыстаюцца дадзенай паслугай. Жанчыны ў параўнанні з мужчынамі больш станоўча адносяцца да шлюбнай дамовы, лічаць гэты дакумент сродкам стрымлівання разводаў, мерай маральнага ўмацавання сям'і.

Матывацыя ўступлення ў шлюб – падмурак трывалых адносін у сям'і, яе маральнага даўгалецця. Аналіз матывацыі ўступлення ў шлюб беларусаў паказвае, што асноўнымі матывамі ўступлення ў шлюб сённяшняга пакалення з'яўляюцца каханне і традыцыі нацыянальнай культуры, якія ўключаюць годныя ўяўленні аб сямейным шчасці, каштоўнасці нараджэння і выхавання дзяцей. Гэтыя матывы

пераважаюць у рэспандэнтаў з вышэйшай адукацыяй, з'яўляюцца дамінуючымі ў асяроддзі людзей сталага ўзросту і тых апытаных, якія маюць вялікі стаж сямейнага жыцця. Аднак нельга пакінуць па-за ўвагай матыў матэрыяльнай выгады: яго трансфармацыя часам набывае маштабныя памеры, і матэрыяльны дастатак ператвараецца са сродку жыццезабеспячэння сям'і ў сэнс усяго жыцця. Можна канстатаваць, што такая небяспечная тэндэнцыя закранула не толькі еўрапейскія, але і беларускія сем'і.

Прыярытэтнай формай заключэння шлюбу сучасных сем'яў з'яўляецца святочная рэгістрацыя шлюбу ў органах ЗАГС, якая, як правіла, праходзіць згодна з юрыдычным заканадаўствам краіны. Акт заключэння шлюбу – значная падзея, якая мае не толькі асабістае, але і грамадскае значэнне. Важнейшай прыкметай шлюбнай урачыстасці становіцца абрадавая частка свята, якая асабліва цікава праводзіцца ва ўстановах культуры рэспублікі. Устойлівай тэндэнцыяй фарміравання шлюбна-сямейных адносін з'яўляецца асвячэнне шлюбу. Многія сем'і сумяшчаюць афіцыйную рэгістрацыю шлюбу ў ЗАГСе з асвячэннем шлюбу ў храме. Сучасную рэчаіснасць адлюстроўвае таксама і наяўнасць незарэгістраваных шлюбаў (сужыццяў), да якіх у грамадстве склаліся талерантныя адносіны.

Захоўваюцца рысы традыцыйнай абраднасці беларусаў, што выяўляецца ў абрадзе хрышчэння дзіцяці і святкаванні хрэсьбін. Важнай прыметай сучаснага радзіннага абраду з'яўляецца прыхільнасць маладых сям'яў да хрышчэння. Спалучэнне афіцыйнай дзяржаўнай рэгістрацыі дзяцей з хрышчэннем іх у храме, а затым святкаванне гэтай падзеі сярод родных людзей, сваякоў і сяброў, часам з выкарыстаннем элементаў традыцыйных радзінных абрадаў, – устойлівая прыкмета этнакультурных працэсаў у гарадскіх сем'ях [1, с. 58–104; 2, с. 27–32; 3, с. 356–367; 4, с. 47–54; 9, с. 294–305; 10, с. 21–28; 12, с. 91–95].

4. Фундаментальным прынцыпам функцыянавання і рэпрадуктавання этнакультурных працэсаў з'яўляецца механізм пераемнасці сямейных традыцый, які ўвасабляецца ў двух напрамках: захаванасці і бытаванні грамадскіх і сямейна-асобасных традыцый. Значным паказчыкам ступені захаванасці і бытавання грамадскіх традыцый з'яўляюцца каляндарныя звычаі і абрады беларусаў. У традыцыйным грамадстве каляндарныя святы ўплывалі на фарміраванне калектывізму як моцнай асновы ўкладу жыцця сям'і, выконвалі аб'яднальную ролю. У 90-я гады ХХ ст. узмацнілася цікавасць гараджан да народных каляндарных абрадаў. Менавіта ў гэтыя часы былі адроджаны лепшыя каляндарныя святы – Каляды, Вялікдзень, Купалле.

На сучасным этапе каляндарныя звычаі і абрады з'яўляюцца істотнай часткай структуры сямейных традыцый беларусаў: яны ўключаны ў кола дзяржаўных і сямейных свят, іх калектывісцкі характар, насычанасць традыцыйнай сімволікай, прафесійная пастаноўка і высокае мастацкае майстэрства ўдзельнікаў забяспечваюць выкананне значных для сям'і функцый – выхаваўчай, пазнавальнай, рэкрэацыйнай, кампенсатарнай, эмацыянальна-псіхалагічнай. Захаванасць ведаў аб каляндарных абрадах і святах асабліва выразна праяўляецца на мясцовым,

лакальным узроўні. Дадзеная тэндэнцыя характэрна для сямейных жыхароў малых гарадоў, для сем’яў пашыранага складу, сям’яў з вышэйшай адукацыяй, сем’яў, у якіх падтрымліваюцца цесныя сувязі з роднымі беларускай нацыянальнасці.

Перадача ведаў аб каляндарных звычаях і сямейных абрадах ажыццяўляецца праз бацькоў. Бацькі – актыўныя носьбіты этнічнай інфармацыі, што тлумачыцца звужэннем кола транслятараў этнічных ведаў, захаваннем традыцыі не на міжпакаленным, а на сямейным узроўні. Важным сродкам трансляцыі этнакультурных ведаў становяцца сродкі масавай інфармацыі і камп’ютэрныя тэхналогіі. Значнае месца ў засвойванні нацыянальнай традыцыі мае асабісты ўдзел членаў сям’і ў фальклорна-этнаграфічных калектывах, якія суправаджаюць каляндарныя святы [1, с. 128–147; 11, с. 21–28].

5. Пазітыўная дынаміка этнакультурных працэсаў у сям’і выяўляецца ў захаванні цэласнасці этнакультурнага комплексу сямейна-бытавых абрадаў (вясельных, радзінных, абрадаў ушанавання продкаў). Даследаваны змяненні ў сямейна-бытавой абраднасці гараджан, якія жывуць у гарадах рознага тыпу. Выяўлена, што сямейным гараджанам вядомы многія элементы традыцыйнага беларускага вяселля, якія складаюць давясельную, вясельную і паслявясельную часткі. Характэрнай асаблівасцю беларускага вяселля, праяўленнем калектывізму з’яўляецца наяўнасць аб’яднальных абрадавых падзей такіх як сумесныя застоллі, адорванне жаніха і нявесты і іх сваякоў, падзел каравая і інш. Больш за трэцюю частку тых, хто не толькі ведаюць абрады беларускага вяселля, але і прытрымліваюцца іх, складаюць жыхары малых гарадоў, менш трэці – жыхары сярэдніх гарадоў.

Сярод апытаных жыхароў беларускіх гарадоў, якія выконвалі традыцыйныя элементы радзіннай абраднасці, больш за трэцюю частку складаюць жыхары буйных гарадоў рэспублікі, менш трэці – жыхары сярэдніх гарадоў. Рэспандэнты, якія выконвалі элементы абраду ўшанавання продкаў, з’яўляюцца жыхарамі буйных, малых, сярэдніх гарадоў рэспублікі, абрад выконваецца ў Мінску таксама. Вельмі значным асяроддзем, дзе захаваны і маюць распаўсюджванне традыцыйныя сямейна-бытавыя абрады беларускага народа з’яўляюцца малыя і сярэднія гарады, моцна яны ўкаранёны і ў буйных гарадах і г. Мінску.

Найбольш захаванымі традыцыйнымі абрадамі на сучасным этапе ў параўнанні з перыядам 70-80-х гг. XX ст. і 80-90-мі гг. XXI ст. з’яўляюцца радзінны абрад (захаваны элементы: хрышчэнне ў царкве, інстытут кумаўства, святочнае застолле з падарункамі маці і дзіцяці) і абрад ушанавання продкаў (захаваны элементы: догляд могілкаў, памінанне памёршых у храме, наведванне могілак у час Радаўніцы, Дзядоў, гадавіны смерці, памінальная трапеза). Больш інавацый утрымлівае вясельны абрад (выкарыстанне фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў лакальнага зместу з сучасным музычна-паэтычным суправаджэннем) [1, с. 147–166; 2, с. 27–32; 5, с. 48–52; 8, с. 89–94; 10, с. 21–28].

6. У роднасна-сваяцкіх і бацькоўска-дзіцячых адносінах, традыцыях міжпакаленнай трансмісіі адбываецца станаўленне мадэлі новага тыпу – мадэлі больш дэмакратычных гарманічных адносін паміж роднымі людзьмі. Бацькоўска-дзіцячыя адносіны ў многіх сем’ях будуюцца на прынцыпах партнёрства,

супрацоўніцтва і даверу, а да сваякоў – на прынцыпах павагі, клопату і добразычлівасці. Паказчыкам, які дае магчымасць адзначыць гэту тэндэнцыю, з’яўляецца захаванасць у сям’і традыцый матэрыяльнай і маральнай падтрымкі і дапамогі, становішча выхаваўчай дзейнасці сям’і. Разам з тым, неабходна адзначыць, што сістэма роднасна-сваяцкіх адносін значна змянілася: назіраецца адчужанасць сваякоў, аддаленасць ад іх агульных спраў, аслабленне узаемнай падтрымкі і дапамогі  і інш.

Гэтыя працэсы закранаюць і бацькоўска-дзіцячыя адносіны. Захоўваюцца мадэлі міжпакаленнай трансмісіі: традыцыі матэрыяльнай падтрымкі і дапамогі бацькамі дзяцей і маральнай – дзецьмі бацькоў застаюцца важнейшым сродкам аб’яднання сям’і, узаемнага клопату, праяўленнем  любві і павагі. Заўважана наступная тэндэнцыя: змяншаецца значнасць жыццёвага прыкладу бацькоў для пераймання і паўтарэння дзецьмі,  у свядомасці маладых пакаленняў фарміруецца імкненне да самастойнасці і незалежнасці ў паводзінах і выбары мадэлей жыцця.

Ступень захаванасці міжпакаленных адносін аказвае ўплыў на выхаваўчыя здольнасці бацькоў. Сучаснаму інстытуту бацькоўства ўласцівы такія асаблівасці, як павышэнне ўзроўню адказнасці бацькоў за нараджэнне і выхаванне дзяцей, іх адукацыю і фарміраванне актыўнай грамадзянскай пазіцыі. І нават калі бацькі не ў поўнай меры валодаюць неабходнымі педагагічнымі ведамі, працэс выхавання абавязкова дае плён пры ўмове выкарыстання традыцыйных прыёмаў народнай педагогікі і ажыццяўленні яго на ўласным станоўчым прыкладзе. Немалаважным складнікам поспеху ў выхаванні з’яўляецца і павышэнне ўзроўню матывацыі на фарміраванне паўнавартаснай, высокаразвітай асобы, якое апошнім часам становіцца ўсё больш уласцівым для гарадской сям’і.

Станаўленне мадэлі новага тыпу ў роднасна-сваяцкіх і бацькоўска-дзіцячых адносінах, традыцыях міжпакаленнай трансмісіі – прыкмета паскоранага развіцця этнакультурных працэсаў у сям’і. Гэта аб’ектыўная рэальнасць сучаснасці, для якой характэрны наступныя ўласцівасці: высокі ўзровень інфармаванасці маладых пакаленняў, здольнасць да адаптацыі да новага ў кароткія тэрміны, хуткае авалоданне моўнымі і тэхнічнымі сродкамі зносін, імкненне дасягнуць поспеху ў прафесійным станаўленні і асабістым развіцці і інш.

Гарадская сям’я беларусаў захоўвае нацыянальныя  традыцыі ў выхаванні дзяцей. Перавага надаецца выхаванню праз працу, навучанню канкрэтнаму віду дзейнасці. Істотная роля адводзіцца метадам суправаджэння і падтрымкі дзяцей, карэкціроўкі іх паводзін, якія  адносяцца да сферы маральных узаемадзеянняў паміж бацькамі і дзецьмі. Гэтыя адметнасці – выразная прыкмета гуманізацыі асяроддзя сям’і, паказчык узорнага бацькоўства.

Высветлена аднак, што ў сямейным выхаванні выкарыстоўваюцца і пакаральныя метады. Такія метады прымяняюцца ў няпоўных сем’ях, што з’яўляецца асабліва небяспечным, бо можа прывесці да цяжкіх псіхічных і маральных змяненняў у развіцці  асобы. Заўважана, што пакаральныя метады непрымальныя для большасці бацькоў з г. Мінска. Названыя тэндэнцыі сведчаць пра зніжэнне  ўзроўню педагагічнай культуры бацькоў і як вынік – памылкі і хібы ў выхаванні дзяцей.

Сучасныя бацькі захоўваюць прынцып пераемнасці ў атрыманні ведаў аб народнай педагогіцы – многія з іх падтрымліваюць пастаянную сувязь з жывымі носьбітамі традыцый – бабулямі і дзядулямі. Не менш значнай крыніцай атрымання ведаў становяцца вусная народная творчасць, фальклор, мастацкая літаратура, відэапрадукцыя, што выкарыстоўваецца ў сямейнай педагогіцы. Аднак сучасным бацькам усё ж не хапае псіхолага-педагагічных ведаў, навыкаў авалодвання методыкамі выхавання дзяцей. Апраўданай у часе формай работы з бацькамі могуць стаць народныя бацькоўскія універсітэты, якія існавалі ў 70–80-я гады XX ст. Адраджэнне гэтага напрамку работы можа паспрыяць павышэнню педагагічнай культуры бацькоў, прафілактыцы сацыяльнага сіроцтва.

У аснову адукацыйнай дзейнасці з бацькамі можа быць пакладзена тэорыя ненасілля як гуманная сістэма ведаў, заснаваная на прынцыпах народнай педагогікі, а функцыю па ўкараненні яе методык на практыцы могуць ажыццяўляць педагогі, псіхолагі, а таксама сацыяльныя педагогі і сацыяльныя работнікі як спецыялісты, якія працуюць з сям'ёй і маюць заслужаны аўтарытэт [1, с. 128–205; с. 166–205; 6, с. 7–11; 15, с. 39–45; 17, с. 106–114; 18, с. 145–156; 19, с. 107–115; 20, с. 77–81; 21, с. 79–85].

7. Аналіз практычнага вопыту рэалізацыі сацыяльна-педагагічнага і выхаваўчага патэнцыялу нацыянальных традыцый ва ўстановах адукацыі і культуры паказвае, што ў іх дзейнасці назапашана шмат змястоўных напрамкаў працы, што спрыяе працэсам сацыялізацыі і выхавання сучасных пакаленняў беларусаў. Асобнае месца належыць мэтанакіраванай адукацыйнай рабоце з сям'ёй. Заўважана, што ўзрасла яе цікавасць да этыкі і псіхалогіі сямейнага жыцця, да прававой інфармацыі, да методык выхавання.

Шырокія магчымасці для работы з сям'ёй адкрываюцца ў сацыякультурнай сферы. Развіццё аматарскіх аб'яднанняў, клубаў па інтарэсах, творчых майстэрань спрыяе заахвочванню сямей да творчасці, выканальніцкай дзейнасці, дае магчымасць дзецям праз сумесную з бацькамі дзейнасць далучацца да народнай традыцыі.

Разам з тым аналіз дзейнасці устаноў адукацыі і культуры паказвае, што яны не ў поўнай меры выкарыстоўваюць тыя магчымасці, якія адкрываюцца перад імі ў выніку значнага развіцця матэрыяльнай базы, да таго ж многія з іх маглі б пры жаданні забяспечыць больш высокі ўзровень эфектыўнасці работы з моладдзю па вывучэнні і творчым засвойванні нацыянальнай спадчыны [1, с. 205–220; 13, с. 25–29; 14, с. 23–26; 16, с. 52–57].

8. Аптымізацыя працякання этнакультурных працэсаў у сям'і можа быць забяспечана праз мэтанакіраваную работу ў сістэме адукацыі са студэнцкай моладдзю.

Традыцыйная нацыянальная культура з'яўляецца важным кампанентам падрыхтоўкі моладзі да сямейнага жыцця, суправаджэння маладой сям'і; яна захоўвае мадэлі, узоры і каштоўнасці папярэдніх пакаленняў беларусаў, з'яўляецца істотным сродкам этнізацыі дзяцей. Ва ўмовах шматнацыянальнасці і полікультурнасці гарадской прасторы яна выконвае культурна-адаптацыйную і ахоўную ролі.

Мэтавай групай моладзі па падрыхтоўцы да сямейнага жыцця можа быць студэнцкая моладзь, таму арганізацыя працы з ёй у працэсе вучэбнай і пазавучэбнай дзейнасці, з прымяненнем сучасных методык і ўключэннем ведаў шэрага дысціплін – псіхалогіі, педагогікі, гісторыі, культуры, этналогіі, сацыялогіі – павінна стаць важнейшай місіяй вышэйшых навучальных устаноў. Значнай з'яўляецца роля інстытутаў паслядыпломнай адукацыі, якія могуць стаць інавацыйнымі навукова-метадычнымі цэнтрамі ўдасканалення прафесійнай кампетэнцыі спецыялістаў, што працуюць з моладдзю.

У рабоце з моладзю неабходна ўлічваць не толькі шматнацыянальнасць гарадскога асяроддзя, яго разнастайныя культурныя традыцыі, але і працэсы інтэрнацыяналізацыі сферы адукацыі.

Станаўленне інстытута маладой сям'і ў гэтых умовах патрабуе навыкаў па ўмацаванні сваёй ідэнтычнасці і фарміраванні культуры міжнацыянальных зносін, якія могуць быць набыты на этапе мэтанакіраванай полікультурнай адукацыі. У такім выпадку ідэалы папярэдніх пакаленняў будуць умацоўвацца ў свядомасці новых пакаленняў беларусаў і спрыяць трываласці сям'і і шлюбу [1; с. 220–231; 13, с. 25–29].

## Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў даследавання

Раскрыццё асноўных тэндэнцый і дынамікі этнакультурных працэсаў у гарадской сям'і беларусаў у апошняй трэці XX – пачатку XXI ст., выяўленне сутнасці этнакультурных працэсаў, ацэнка іх функцыянавання і развіцця, вызначэнне ўмоў аптымізацыі ў шматнацыянальнай прасторы беларускага соцыуму – новыя этапы ў вывучэнні стану сям'і і шлюбу, сямейна-бытавой культуры і традыцый, у рамках якіх выкарыстаны комплексны падыход да даследавання праблематыкі сям'і, яе трансфармацый.

Атрыманыя вынікі ўказваюць на неабходнасць узмацнення сям'і, на захаванне маральных устояў і звычаяў, якія былі характэрны для папярэдніх пакаленняў, умацавання ў свядомасці маладых пакаленняў установак на стварэнне вялікай шматдзетнай сям'і. Для гэтага неабходна пашырэнне тэарэтычнай і практычнай базы ведаў аб традыцыйнай нацыянальнай культуры, удасканаленне адукацыйнага і культурнага напрамкаў працы з моладдзю.

Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны ў распрацоўцы дзяржаўных праграм па рабоце з дзецьмі, моладдзю, маладымі сем'ямі, шмадзетнымі сем'ямі; у сістэме вышэйшай адукацыі, падрыхтоўцы кадраў сацыяльнай і сацыякультурнай сферы (сацыяльных педагогаў, сацыяльных работнікаў, культуролагаў, менеджэраў адукацыйнай і сацыякультурнай сферы, прававедаў, гісторыкаў); у выкладанні сацыяльна-гуманітарных і псіхолага-педагагічных дысціплін; у сістэме павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў сістэмы адукацыі (спецыялістаў па рабоце з моладдзю, ідэалагічных работнікаў, куратараў, выхавальнікаў, педагогаў-арганізатараў, выкладчыкаў сацыяльна-гуманітарных дысціплін); у дзейнасці сацыякультурных устаноў, дамоў народнай творчасці, музеяў; у арганізацыі

сямейных урачыстасцей у ЗАГСах краіны; рабоце грамадскіх аб'яднанняў, накіраваных на падтрымку сям'і, бацькоўства і дзяцінства.

Метадалагічнай асновай падрыхтоўкі сацыяльных педагогаў з'яўляецца этнапедагагічная спадчына беларускага народа, грамадскія традыцыі і абрады. Вынікі даследавання, атрыманыя ў ходзе аналізу значнай колькасці матэрыялаў аб засвойванні традыцый выхавання, сацыялізацыі і этнізацыі дзяцей праз нацыянальную культуру, былі ўкаранёны ў навучальны працэс па падрыхтоўцы сацыяльных педагогаў і сацыяльных работнікаў – з 1996 па 2003 год у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў (Акт укаранення ад 15.03.2006 г.). Укараненне вынікаў даследавання садзейнічае павышэнню прафесійнай кампетэнтнасці сацыяльных педагогаў у працы з сем'ямі з улікам традыцый выхавання беларускага народа; узбагачае змест навучальнага працэсу гісторыка-этнаграфічнымі крыніцамі, творамі вуснай народнай творчасці, што спрыяе ўдасканаленню прафесійнага майстэрства.

Вынікі дысертацыйнага даследавання выкарыстаны пры падрыхтоўцы культуролагаў, арганізатараў масавых відовішчаў. Укараненне вынікаў даследавання пашырае практычную базу ведаў гэтых спецыялістаў па сямейна-бытавой абраднасці беларусаў, спрыяе фарміраванню культуры вольнага часу гараджан (Акт укаранення ад 07.04.2006 г.).

Вынікі даследавання ўкаранёны ў вучэбным працэсе па падрыхтоўцы спецыялістаў па сацыяльнай рабоце ў Дзяржаўным інстытуце кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ (Акт укаранення ад 04.03.2009 г.). Матэрыялы даследавання ўзбагацілі тэарэтычную падрыхтоўку спецыялістаў, узровень іх прафесійнай дасведчанасці па пытаннях этнічнай культуры і гісторыі беларускага народа; пашырылі кругагляд спецыялістаў, іх аналітычныя навыкі, уменне вырашаць складаныя сацыяльныя праблемы сучаснасці.

Фарміраванне тэарэтычнай базы падрыхтоўкі сацыяльных педагогаў і сацыяльных работнікаў немагчыма без асэнсавання вопыту і ведаў мінулых пакаленняў і ўключэння іх у кантэкст сучасных умоў і запатрабаванняў. Матэрыялы дысертацыйнага даследавання: аналіз тэндэнцый функцыянавання сям'і і шлюбу, структурна-тыпалагічныя змяненні сям'і, трансфармацыя функцый сям'і выкарыстаны пры распрацоўцы артыкулаў у «Слоўніку сацыяльнага педагога і сацыяльнага работніка» (Акт укаранення ад 24.03.2009 г.).

У Дзяржаўным інстытуце кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ ўкаранёны вынікі даследавання, з улікам патрабаванняў да прафесійных навыкаў спецыялістаў па сацыяльнай рабоце ў працы з сем'ямі, што належаць да іншых нацыянальнасцей і якія жывуць побач з беларускімі сем'ямі. Фарміраванне талерантных адносін да іх, захаванне згоды і добразычлівасці – важнейшая ўмова падтрымкі традыцый этыкі і маралі, якія характэрны для беларускіх сем'яў (Акт укаранення ад 07.03.2009 г.).

Вынікі даследавання апрабаваны ў сістэме павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў вышэйшай адукацыі, якія працуюць з моладдзю. Аўтарскія курсы для спецыялістаў па сацыяльнай і выхаваўчай рабоце з моладдзю, ідэалагічных работнікаў, сацыяльных педагогаў, псіхолагаў,

выхавальнікаў вышэйшай школы Рэспублікі Беларусь укаранёны ў вучэбны працэс па павышэнні кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў у Рэспубліканскім інстытуце вышэйшай школы на працягу 2006–2008 гг. (Акт укаранення ад 26.12.2006 г.; Акт укаранення ад 02.06.2008 г.). Вучэбныя праграмы курсаў павышэння кваліфікацыі прысвечаны засвойванню ведаў аб сямейна-бытавой культуры беларусаў: вясельных, радзінных абрадах, абрадах ушанавання продкаў, іх сімволіцы, сэнсу і значэнню для сям'і, а таксама навучанню творчаму падыходу да выкарыстання элементаў традыцыйнай сямейнай абраданасці ў сучасным жыцці. У выніку ўкаранення аўтарскіх курсаў у слухачоў сфарміравана сістэма прафесійных кампетэнцый, што ўключае веды, уменні і навыкі працы з гісторыка-культурнай спадчынай беларускага народа, яго гістарычнымі, этнаграфічнымі і фальклор-нымі крыніцамі.

Пытанні падрыхтоўкі моладзі да сямейнага жыцця, работы з маладымі сем'ямі, станаўленне сістэмнай работы ў гэтым напрамку – неабходная ўмова паспяховай дзейнасці спецыялістаў, якія працуюць з моладдзю ва ўстановах адукацыі і культуры. Упершыню ў РІВШ пачалася перападрыхтоўка кадраў новага пакалення – арганізатараў працы з моладдзю, кіраўнікоў маладзёжных праграм і праектаў, лідэраў маладзёжных арганізацый і грамадскіх рухаў. У іх прафесійныя кампетэнцыі ўваходзяць пытанні працы з маладымі сем'ямі. Вынікі даследавання дазволілі распрацаваць і ўкараніць у 2008–2009 гг. аўтарскі вучэбны курс для сістэмы перападрыхтоўкі гэтых спецыялістаў (Акт укаранення ад 09.03.2009 г.). У працэсе навучання ў слухачоў была сфарміравана сістэма гісторыка-культурных ведаў аб сям'і, сямейна-бытавой культуры, атрыманы навыкі па правядзенні этнасацыялагічных даследаванняў актуальных праблем сям'і, такіх як здаровы лад жыцця, прафілактычная работа па папярэджанні канфліктаў і разводаў у маладых сем'ях, фарміраванне культуры сямейных адносін у побыце і ў штодзённым жыцці. Матэрыялы дысертацыі: аналіз ступені захаванасці сямейна-бытавой абраднасці ў гарадскіх сем'ях беларусаў; аналіз роднасна-сваяцкіх і бацькоўска-дзіцячых адносін; стан этыкетных адносін у сям'і на сучасным этапе – выкарыстаны ў навучальным працэсе пры падрыхтоўцы спецыялістаў па рабоце з моладдзю.

Значнай часткай прафесійнай культуры арганізатараў работы з моладдзю з'яўляецца полікультурная адукацыя, атрыманне навыкаў міжкультурных зносін. Сям'я – гэта асяроддзе ўмацавання нацыянальнай ідэнтычнасці, захавання самабытнай культурнай спадчыны, што асабліва важна ў шматнацыянальным соцыуме горада. Аўтарскі курс, у якім прадстаўлены вынікі праведзенага даследавання, распрацаваны і ўкаранёны ў сістэму перападрыхтоўкі кадраў па рабоце з моладдзю. Падрыхтаваны і ўкаранёны вучэбна-метадычны дапаможнік да дадзенага курса (Акт укаранення ад 20.03.2009 г.; Акт укаранення ад 09.01.2007 г.).

Вывады даследавання могуць быць выкарыстаны ў распрацоўцы навукова-метадычных рэкамендацый па стварэнні адноўленай сістэмы сямейнай абраднасці на сучасным этапе – спецыялістамі сацыякультурных устаноў, музеяў, работнікамі ЗАГСаў. Матэрыялы даследавання выкарыстаны ў распрацоўцы метадычных рэкамендацый па арганізацыі сямейных урачыстасцей у нацыянальным стылі для Беларускага нацыянальнага музея народнай архітэктуры і быту (Акт укаранення ад 27.02.2009 г.).

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

### Манаграфія

1. Калачова, І.І. Этнакультурныя працэсы ў гарадской сям'і беларусаў у апошняй трэці XX – пачатку XXI ст.: манаграфія / І.І. Калачова. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – 266 с., 4 іл.

### Публікацыі ў рэцэнзаваных навуковых часопісах і зборніках

2. Калачёва, И.И. Актуальные проблемы развития этнокультурных процессов в городской семье белорусов (начало XXI века) / И.И. Калачёва // Вестн. ин-та соврем. знаний. – 2009. – № 1. – С. 27–32.

3. Калачова, І.І. Актуальныя тэндэнцыі развіцця этнакультурных працэсаў у гарадской сям'і беларусаў у апошняй трэці XX – пач. XXI ст.: мадэрнізацыя і урбанізацыя ўкладу жыцця / І.І. Калачова // Пытанні мастацтва, этналогіі і фальклярыстыкі / Ін-т мастацтвазнаўства, этналогіі і фальклора; навук. рэд. А.І. Лакотка. – Мінск, 2009. – Вып. 6. – С. 356-367.

4. Калачова, І.І. Гарадская сям'я беларусаў у апошняй трэці XX – пач. XXI стст.: гістарыяграфія праблемы ў айчынных і замежных этналагічных даследаваннях / І.І. Калачова // Научные труды Республиканского института высшей школы. Исторические и психолого-педагогические науки : сб. науч. ст. В 2 ч. / под ред. В.Ф.Беркова. – Минск : РИВШ, 2009. – Ч.1. Вып.8 (13). – С. 47–54.

5. Калачова, І.І. Сучасная сям'я беларусаў у горадзе: праблемы адаптацыі; захаванне традыцый духоўнай культуры / І.І. Калачова // Весн. Мазыр. дзярж. пед. ун-та. – 2009. – № 1(22). – С. 48–52.

6. Калачова, І.І. Традыцыі міжпакаленных адносін у сучасных гарадскіх сем'ях беларусаў / І.І. Калачова // Весн. Віцеб. дзярж. ун-та. – 2009. – № 1 (51). – С. 7 –11.

7. Калачова, І.І. Этнакультурныя працэсы ў гарадской сям'і беларусаў у апошняй трэці XX – пач. XXI ст.: сутнасць; дынаміка; ацэнка функцыянавання і развіцця / І.І. Калачова // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 2010. – № 1.

8. Колочова, І.І. Сім'я та шлюб у місцах Білорусі: динаміка сучасних етнокультурних процесів / І.І. Колочова // Нар. творчість та етнографія. – 2008. – № 6. – С. 89-94.

9. Калачова, І.І. Гістарыяграфія праблемы сям'і беларусаў у кантэксце еўрапейскай культурнай традыцыі ў другой палове XX – пач. XXI ст. / І.І. Калачова // Пытанні мастацтва, этналогіі і фальклярыстыкі / Ін-т мастацтвазнаўства, этналогіі і фальклора ; навук. рэд. А.І. Лакотка. – Мінск, 2008. – Вып. 4. – С. 294–305.

10. Колочова, І.І. Динаміка розвитку родини і шлюбу білорусів та іі яе вплив на стійкість етнокультурних працэсів в містах Білорусі в кін. XX – поч. XXI ст. / І.І. Колочова // Народознавчі зошити. – 2008. – Зш. 1–2 (79–80). – С. 21–28.

11. Калачова, І.І. Развіццё канцэпцыі эвалюцыянізму ў вывучэнні сямейных традыцый беларусаў у працах айчынных этнографаў (XX–XXI стст.) / І.І. Калачова // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск, 2007. – Вып. 3, ч. 2 : Мастацтва, фальклор, этнічныя традыцыі ў вырашэнні актуальных задач сучаснай культуры : матэрыялы Міжнар. навук. канф., прысвеч. 50-гадоваму юбілею Ін-та мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы НАН Беларусі, Мінск, 7–8 чэрв. 2007 г. : у 2 ч. / навук. рэд. А.І. Лакотка. – С. 101–106.

12. Калачова, І.І. Функцыянальныя і структурныя змяненні сям'і гараджан у Беларусі ў пач. XXI ст.: этнасацыялагічны аспект / І.І. Калачова // Вес. Беларус. дзярж. пед. ун-та. Сер. 2, Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2007. – № 1. – С. 91–95.

13. Калачова, І.І. Беларуская сям'я ў пачатку XXI стагоддзя: традыцыйны і сучасны погляд / І.І. Калачова // Выш. шк. – 2006. – № 3. – С. 25–29.

14. Калачёва, И.И. Поликультурное образование студенчества: вопр. теории / И.И. Калачёва // Выш. шк. – 2004. – № 5. – С. 23–26.

15. Калачова, І.І. Мацярынства як аснова выжывання і сацыяльнага развіцця сям'і / І.І. Калачова // Нар. асвета. – 2000. – № 7. – С. 39–45.

16. Калачова, І.І. Рэалізацыя ідэй ненасілля ў дзейнасці сацыяльных педагогаў / І.І. Калачова // Нар. асвета. – 2000. – № 12. – С. 52–57.

17. Калачова, І.І. Бацькоўства : традыц. и сучас. погляды / І.І. Калачова // Пачатк. навучанне : сям'я, дзіцячы сад, шк. – 1997. – № 1. – С. 106–114.

18. Калачова, І.І. Дом, дзе патрэбна цеплыня. Гісторыка-педагагічныя напрамкі выхаваўчай работы з дзецьмі-сіротамі і дзецьмі, пазбаўленымі бацькоўскай апекі / І.І. Калачова // Нар. асвета. – 1997. – № 5. – С. 145–156.

19. Калачова, І.І. Этнапедагагічныя традыцыі і іх выкарыстанне ў сучасным выхаванні / І.І. Калачова // Праблемы выхавання. – 1997. – № 6. – С. 107–115.

20. Калачова, І.І. Роля сям'і ў трансмісіі этнапедагагічных традыцый беларусаў / І.І. Калачова // Адукацыя і выхаванне. – 1995. – № 4. – С. 77–81.

21. Калачова, І.І. Сямейнае выхаванне на Беларусі (другая палова XIX ст. – пачатак XX ст.) / І.І. Калачова // Адукацыя і выхаванне. – 1994. – № 10. – С. 79–85.

**Навуковыя выданні і дапаможнікі**

22. Калачёва, И.И. Семья в современном белорусском обществе: реалии и перспективы развития / И.И. Калачёва. – Минск: Респ. ин-т высш. шк., 2008. – 77 с.

23. Калачёва, И.И. Молодёжь и поликультурное образование в высшей школе Беларуси: пособие для адм.-упр. кадров высш. шк. / И.И. Калачёва. – Минск: Тесей, 2003. – 158 с.

24. Калачова, І.І. Ад добрага кораня – добры парастак : этнапед. традыцыі беларусаў у выхаванні дзяцей : дапам. для педагогаў дашк. установ / І.І. Калачова. – Мінск : НМЦэнтр, 1999. – 124 с.

25. Калачова, І.І. Народныя традыцыі і звычаі выхавання: этнапед. спадчына народаў Беларусі / І.І. Калачова. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 1999. – 179 с.

## Публікацыі ў кнігах, зборніках і часопісах

26. Калачова, І.І. Гарадская сям'я / І.І. Калачова // Беларусы: сучасныя этнакультурныя працэсы / Г.І.Каспяровіч [і інш.]; НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск: Бел. навука, 2009. – С. 89–149.

27. Калачова І.І. Сучасная сям'я беларусаў у горадзе: праблемы адаптацыі, захавання традыцый духоўнай культуры // Праблемы выхавання. – 2009. – № 1. – С. 12–16.

28. Калачёва, И.И. Динамика изменений в семейно-брачных отношениях белорусов: этнокультур. аспект / И.И. Калачёва // Сац.-пед. работа. – 2008. – № 5. – С. 14–17.

29. Калачёва, И.И. Ненасилие в теории и практике социально-педагогической работы с детьми и учащейся молодёжью / И.И. Калачёва // Воспитание личности в социокультурном пространстве / А.П. Байко [и др.] ; науч. ред. В.Н. Наумчик. – Минск, 2008. – С. 92–100.

30. Калачёва, И.И. Преемственность семейных традиций как фактор стабильности этнокультурных процессов / И.И. Калачёва // Адукацыя і выхаванне. – 2008. – № 4. – С. 3–8.

31. Калачёва, И.И. Семья как фактор этнической стабильности в условиях интенсификации миграционных процессов в Беларуси / И.И. Калачёва // Гастарбайтерство: факторы адаптации / сост. Н.А. Дубова. – М., 2008. – С. 265–276.

32. Калачова, І.І. Гарадская сям'я: этнакультурныя працэсы на сучасным этапе / І.І. Калачова // Адукацыя і выхаванне. – 2008. – № 11. – С. 28–32.

33. Калачова, І.І. Падрыхтоўка моладзі да сямейнага жыцця і працы з маладымі сем'ямі ў сістэме павышэння кваліфікацыі / І.І. Калачова // Воспитание в сотворчестве (активные методы в воспитательной работе с учащейся молодежью) : сб. науч. ст. / Респ. ин-т высш. шк.; под науч. ред. В.В. Познякова. – Минск, 2008. – С. 174–181.

34. Калачёва, И.И. Студенческая молодёжь и поликультурное образование в высшей школе / И.И. Калачева // Организационно-педагогические и идеологические основы работы с молодежью в высшей школе: из опыта работы специалистов по социальной и воспитательной работе со студенческой молодежью и кураторов студенческих групп : сб. ст. / под общ. ред. И.И. Калачёвой, С.А. Кулеш. – Минск : Респ. ин-т высш. шк., 2006. – С. 30–35.

35. Калачёва, И.И. Социальный педагог в высшей школе: становление профессиональной культуры / И.И. Калачёва // Организационно-педагогические и идеологические основы работы с молодежью в высшей школе: из опыта работы специалистов по социальной и воспитательной работе со студенческой молодежью и кураторов студенческих групп : сб. ст. / под общ. ред. И.И. Калачёвой, С.А. Кулеш. – Минск : Респ. ин-т высш. шк., 2006. – С.19–26.

36. Калачёва, И.И. Технологии обучения толерантности и толерантному общению специалистов высшей школы в системе повышения квалификации в Беларуси / И.И. Калачёва // Нові технології навчання : наук.-метод. зб. / Ін-т інновац. технологій і змісту освіти МОН України. – Рівне, 2004. – Вип. 9. – С. 52–59.

37. Kalachova, I.I. Actualization of ideas related a Culture of Peace and Tolerance in Today's Belarussian Universities / I.I. Kalachova, I.I. Gancheronak //

UNESCO Chairs in Human Rights, Democracy, Peace and Tolerance. – 2002. – Bull. 4. – P. 196–198.

38. Калачёва, И.И. Защита прав детей и подростков Беларуси в повседневной жизни в условиях школьных и внешкольных учреждений / И.И. Калачёва // Гісторыя штодзённасці і правы чалавека : матэрыялы Міжнар. канф., Мінск, 1–5 снеж. 1999 г. / уклад.: П. Садоўскі, М. Тэлюс. – Мінск, 2000. – С. 221–232.

39. Калачёва, И.И. Идеи ненасилия в гуманистической педагогике / И.И.Калачёва // Воспитание в современных условиях : сб. науч. ст. / науч. ред. О.П. Котикова. – Минск, 1999. – С. 44–52.

40. Калачёва, И.И. Профессиональное становление школьных социальных педагогов : этнопсихопед. аспекты / И.И. Калачёва // Сац.-пед. работа. – 1999. – № 4. – С. 51–58.

41. Калачёва, И.И. Развитие идей гуманизма и ненасилия в социально-педагогической работе / И.И. Калачёва // Адукацыя і выхаванне. – 1999. – № 11. – С. 17–21.

42. Калачова, І.І. Беларускі песенны фальклор і яго тэрапеўтычнае значэнне / І.І. Калачова, Т.М. Крыўко // Проблемы социальной педагогики в школе : науч.-метод. материалы в помощь соц. педагогу / Нац. ин-т образования ; науч. ред. И.И. Калачёва. – Минск, 1999. – С. 119–123.

43. Калачёва И.И. Ненасилие как важнейшая социально-педагогическая проблема современного воспитания / Калачёва И.И. // Проблемы социальной педагогики в школе : науч.-метод. материалы в помощь соц. педагогу / Нац. ин-т образования ; науч. ред. И.И. Калачёва. – Минск, 1999. – С. 36–42.

44. Калачёва И.И. Этнопедагогические аспекты социального воспитания / Калачёва И.И. // Проблемы социальной педагогики в школе: науч.-метод. материалы в помощь соц. педагогу / Нац. ин-т образования; науч. ред. И.И. Калачёва. – Минск, 1999. – С. 61-69.

45. Калачова, І.І. Народная педагагічная спадчына як сродак гуманістычнага фарміравання асобы / І.І. Калачова // Гуманистическое формирование личности в современных условиях : сб. науч. ст. / науч. ред. О.П. Котикова. – Минск, 1998. – С. 54–64.

46. Калачёва, И.И. Роль семьи в формировании положительных взглядов молодёжи к народным традициям / И.И. Калачёва // Сборник статей по основным направлениям научно-исследовательской работы : в 2 ч. / Мин. ин-т культуры. – Минск, 1990. – Ч. 2. – С. 10–17.

## Матэрыялы дакладаў навуковых канферэнцый

47. Калачёва, И.И. Формирование ценностного отношения молодёжи к семье и браку: традиции национальной культуры и инновации современности / И.И. Калачёва // Гражданское воспитание студентов БГУФК: традиции и инновации : материалы Регион. науч.-метод. конф., посвящ. 15-летию ист.-этногр. музея каф. философии и истории, Минск, 18 апр. 2008 г. / Белорус. гос. ун-т физ. культуры ; редкол.: М.Е. Кобринский (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 2008. – С. 29–34.

48. Калачова, І.І. Гарадская сям'я беларусаў: тэндэнцыі этнакультурнага развіцця на сучасным этапе / І.І. Калачова // Традыцыйная культура і дзеці: праблемы этнавыхавання / Беларус. дзярж. ін-т праблем культуры ; аўт. праекта і ўклад. М.А. Козенка. – Мінск, 2008. – Вып. 3 : Матэрыялы IV Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі (2–3 красавіка 2008 г., г.п. Акцябрскі) / рэдкал.: М.А. Козенка, А.М. Боганева, Т.Б. Варфаламеева. – С. 169–175.

49. Калачова, І.І. Гарадская сям'я беларусаў у этнакультурных працэсах у пачатку XXI стагоддзя / І.І. Калачова // Менталитет восточных славян и интеграционные процессы: история, современность, перспективы : материалы V Междунар. науч. конф., Гомель, 24–25 мая 2007 г. / Гомел. гос. техн. ун-т ; под общ. ред. В.В. Кириенко. – Гомель, 2007. – С. 207–209.

50. Калачёва, И.И. Поликультурное образование как механизм оптимизации межкультурного диалога молодёжи Беларуси и России / И.И. Калачёва // Межкультурный и межрелигиозный диалог в целях устойчивого развития : материалы междунар. конф., Москва, 13-16 сен. 2007 г. / Рос. акад. гос. службы при Президенте Рос. Федерации ; общ. ред. В.К. Егорова. – М., 2008. – С. 663–666.

51. Калачёва, И.И. Поликультурное образование и воспитание студенческой молодежи в общежитии: опыт, реалии и прогнозы / И.И. Калачёва // Современные подходы к организации воспитательной работы в условиях общежитий : сб. ст. респ. семинара-практикума, Минск, 17–18 марта 2004 г. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: Г.А. Бутрим (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2004. – С. 136–141.

52. Калачёва, И.И. Актуальные проблемы поликультурного образования студенческой молодежи в процессе интернационализации вузов Беларуси / И.И. Калачёва // Восточнославянские страны в эпоху глобализации: выбор путей развития : материалы Междунар. науч. конф., 26–27 нояб. 2003 г., Гродно / Гродн. гос. ун-т ; под ред. Ч.С. Кирвеля [и др.]. – Гродно, 2003. – С. 15–20.

53. Калачова, І.І. Беларуская народная педагогіка ў сістэме падрыхтоўкі сацыяльных педагогаў / І.І. Калачова // Пути повышения качества профессиональной подготовки педагогических кадров с университетским образованием : материалы респ. науч.-практ. конф. / Белорус. гос. ун-т ; под ред. А.П. Сманцера. – Минск, 1995. – С. 191–193.

## Тэзісы дакладаў навуковых канферэнцый


54. Калачёва, И.И. Семейно-брачные отношения в традиционной и современной белорусской семье / И.И. Калачёва // Женская и гендерная история Отечества: новые проблемы и перспективы: Материалы Междунар. научной конференции (19-21 июня 2009 г., г. Петрозаводск, Республика Карелия) / Институт этнологии и антропологии им. Н.Н. Миклухо-Маклая РАН; Российская ассоциация исследователей женской истории. – М.: ИЭА РАН, 2009. – С. 24–25.

55. Калачёва, И.И. Возрождение ценностного потенциала семьи и брака в Беларуси: сохранение традиций национальной культуры / И.И. Калачёва // Этнокультурные и этноконфессиональные образования: проблемы и перспективы развития : материалы Междунар. науч.-практ. конф., 9–11 дек. 2008 г. / под. ред. Н.Ф. Беляевой. – Саранск, 2008. – С. 24–29.

56. Калачова, І.І. Роля праваслаўных традыцый у духоўным жыцці сучаснай гарадской сям’і беларусаў / І.І. Калачова // Традиции православной духовности в нравственном воспитании и предупреждении семейного неблагополучия : сб. докл. X Свято-Евфросин. пед. чтений, 11–15 нояб. 2008 г., Минск / сост.: А.И. Осипов, А.В. Бройко, А.А. Ананенко. – Минск, 2008. – С. 170–173.

57. Калачёва, И.И. Укрепление межэтнической толерантности в белорусском обществе: решение проблем культурной адаптации беженцев / И.И. Калачёва // Беларусь в современном мире: материалы VII Междунар. науч. конф., посвящ. 87-летию образования Белорус. гос. ун-та, Минск, 30 окт. 2008 г. / редкол.: В.Г. Шадурский [и др.]. – Минск, 2008. – С. 269–270.

58. Калачёва, И.И. Городская семья белорусов: динамика этнического развития в начале XXI в. / И.И. Калачёва // VII Конгресс этнографов и антропологов России : докл. и выступления, Саранск, 2–14 июля 2007 г. / НИИ гуманитар. наук при правительстве Респ. Мордовия ; редкол.: В.А. Тишков [и др.]. – Саранск, 2007. – С. 206.

59. Калачёва, И.И. Поликультурное образование студенческой молодёжи как фактор интеграции национальной системы белорусской высшей школы в образовательное пространство СНГ / И.И. Калачёва // Проблемы и перспективы сотрудничества государств-участников СНГ в формировании единого (общего) образовательного пространства: тр. Междунар. науч.-практ. конф., Москва, 20–21 окт. 2004 г. / Рос. ун-т дружбы народов. – М., 2004. – С. 721–725.

60. Калачёва, И.И. Поликультурное образование в контексте модернизации современного социально-гуманитарного знания / И.И. Калачёва // Университетское образование и наука в XXI столетии : материалы Междунар. науч.-метод. конф., Минск, 24 окт. 2003 г. / Респ. ин-т высш. шк. ; редкол.: Я.С. Яскевич [и др.]. – Минск, 2003. – С. 100–102.

61. Калачёва, И.И. Профессиональное образование социальных педагогов по работе с семьей: культурологический аспект / И.И. Калачёва // Актуальные проблемы социально-психологической помощи семье: теория и практика: материалы Междунар. науч.-практ. конф., 28–29 нояб. 2000, Минск / Белорус. фонд соц. поддержки детей и подростков «Мы – детям» ; редкол.: Н.И. Мицкевич (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2000. – С. 70–73.

62. Калачёва, И.И. Арт-терапия и её использование в практике социально-педагогической реабилитации / И.И. Калачёва // Социально-психологическая реабилитация населения, пострадавшего от экологических и техногенных катастроф = Psychosocial rehabilitation of population suffered of ecological and technical catastrophe : VI Междунар. конф. Минск, Респ. Беларусь, 26–29 мая 1999 г. : материалы конф. / Нац. ин-т образования ; редкол.: Л.А. Пергаменщик (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1999. – С. 87.

63. Калачёва, И.И. Культура и этнокультура в системе профессионального образования социальных педагогов / И.И. Калачёва // Подготовка социальных педагогов и социальных работников: проблемы, тенденции, опыт : материалы II Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 27–28 апр. 1999 г. / Белорус. гос. пед. ун-т; редкол.: Т.П. Михневич [и др.]. – Минск, 1999. – С. 128–131.

64. Калачова, І.І. Аб выкарыстанні этнакультурнай спадчыны ў сацыяльна-педагагічнай рабоце / І.І. Калачова //Личность ребенка: развитие творческих способностей и формирование культуры мира : науч.-практ. конф., 26–28 мая 1998 г., Респ. пионер. лагерь «Зубренок» : материалы конф. : в 2 ч. / Белорус. фонд соц. поддержки детей и подростков «Мы – детям» ; под ред. В.Т. Кабуша. – Минск, 1998. – Ч. 1. – С. 80–84.

65. Калачова, І.І. Этнасацыяльныя праблемы работы з сям’ёй / І.І. Калачова // Система гуманитаризации образования в Республике Беларусь: концептуальные основы, модели, уровни, управление : тез. докл. участников Междунар. науч.-метод. конф. / Респ. ин-т высш. шк. ; редкол.: А.В. Макаров (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1996. – С. 84–85.

66. Калачова, І.І. Месца традыцыйнага сямейнага выхавання беларусаў у падрыхтоўцы сацыяльных педагогаў / І.І. Калачова // Прафесіяналізм выкладчыкаў універсітэта ва ўмовах пераходу да шматузроўневай сістэмы адукацыі : тэз. дакл. на навук.-метад. канф., 1–2 лют. 1994 г. / Беларус. ун-т культуры ; рэдкал.: А.І. Смолік (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1994. – С. 80–81.

67. Калачова, І.І. Аб некаторых асаблівасцях сямейнага выхавання беларусаў (кан. XIX–пач. XX ст.) / І.І. Калачова // Адукацыя і нацыянальна-культурнае адраджэнне : тэз. навук. дакл. на Міжнар. канф., 25–26 кастр. 1994 г., Мінск : у 2 ч. / Нац. ін-т адукацыі. – Мінск, 1994. – Ч. 1. – С. 107–108.

68. Калачова, І.І. Роля сямейных этнапедагагічных традыцый беларусаў у павышэнні педагагічнай культуры бацькоў / І.І. Калачова // Актуальныя праблемы і навуковыя пошукі ў галіне культуры і мастацтва : тэз. дакл. на навук.-творч. канф., 19–20 крас. 1994 г. / Беларус. ун-т культуры ; пад рэд. А.К. Лягчылава. – Мінск, 1994. – С. 25–26.

69. Калачова, І.І. Роля сямейных этнапедагагічных традыцый у фарміраванні дзіцяці ранняга ўзросту / І.І. Калачова // Роля сям'і і дашкольных устаноў у развіцці асобы дзіцяці ў святле педагагічных ідэй Л.С. Выгоцкага і яго паслядоўнікаў : тэз. Міжнар. навук.-практ. канф., 3–6 кастр. 1994 г. / склад.: Т.М. Карасцялёва [і інш.]. – Гомель, 1994. – Ч. 1. – С. 30–32.

## Вучэбныя праграмы, метадычныя рэкамендацыі

70. Калачёва, И.И. Социально-педагогическое сопровождение семейно-брачных отношений в студенческой среде: учебная программа повышения квалификации для социальных педагогов высшей школы // Семья в современном белорусском обществе: реалии и перспективы развития / И.И. Калачёва. – Минск : Респ. ин-т высш. шк., 2008. – С.53–62.

71. Калачёва, И.И. Поликультурное образование студенческой молодежи : учеб.-темат. план и программа курса (для административ.-упр. кадров системы повышения квалификации) / И.И. Калачёва. – Минск : Респ. ин-т высш. шк. БГУ, 2003. – 16 с.

72. Калачёва, И.И. Профессиональная культура социального педагога : учеб.-темат. план и программа курса для системы повышения квалификации специалистов образования и высш. шк. / И.И. Калачёва // Профессиональная культура социального педагога / С.А. Валаханович, О.В. Липневич, И.И. Калачёва [и др.] ; отв. ред. И.И. Калачёва. – Минск, 2002. – С. 74–87.

73. Калачёва, И.И. Этика ненасилия : учеб.-темат. план и программа курса для системы повышения квалификации специалистов образования и высш. шк. / И.И. Калачёва // Профессиональная культура социального педагога / С.А. Валаханович, О.В. Липневич, И.И. Калачёва [и др.] ; отв. ред. И.И. Калачёва. – Минск, 2002. – С. 87–95.

74. Калачова, І.І. Хлеб : сцэнарый ранішніка / І.І. Калачова // Пралеска. – 1997. – № 9. – С. 22–24.

75. Калачова, І.І. Пазнавальна-забаўляльная гульня «Шчаслівая зорачка» / І.І. Калачова // Праблемы выхавання. – 1996. – № 5. – С. 121–128.

76. Калачёва, И.И. Рекомендации в помощь воспитателям общежитий / И.И. Калачёва. – Минск : Белсовпроф, 1987. – 19 с.

## Публікацыі ў даведачных і энцыклапедычных выданнях

77. Калачёва, И.И. Благополучие семейное / И.И. Калачёва // Словарь социального педагога и социального работника / под общ. ред. И.И. Калачёвой [и др.]. – 2-е изд. – Минск, 2003. – С. 17.

78. Калачёва, И.И. Территориальный центр социального обслуживания семьи и детей / И.И. Калачёва // Словарь социального педагога и социального работника / под общ. ред. И.И. Калачёвой [и др.]. – 2-е изд. – Минск, 2003. – С. 219–220.

79. Калачёва, И.И. Дядькование / И.И. Калачёва // Социальная педагогика : опыт слов.-справ. / под общ. ред. И.И. Калачёвой, Я.Л. Коломинского, А.И. Левко. – Минск, 2000. – С. 56.

80. Калачёва, И.И. Народная педагогика / И.И. Калачёва // Социальная педагогика : опыт слов.-справ. / под общ. ред. И.И. Калачёвой, Я.Л. Коломинского, А.И. Левко. – Минск, 2000. – С. 114.

81. Калачёва, И.И. Ненасилие / И.И. Калачёва // Социальная педагогика : опыт слов.-справ. / под общ. ред. И.И. Калачёвой, Я.Л. Коломинского, А.И. Левко. – Минск, 2000. – С. 115.

82. Калачёва, И.И. Народная педагогика / И.И. Калачёва // Детское движение: словарь-справочник / ред.-сост. Т.В. Трухачёва. – М. ; Минск, 1998. – С. 62.

## РЭЗЮМЕ

Калачова Ірына Іванаўна

## ЭТНАКУЛЬТУРНЫЯ ПРАЦЭСЫ Ў ГАРАДСКОЙ СЯМ'І БЕЛАРУСАЎ У АПОШНЯЙ ТРЭЦІ ХХ – ПАЧАТКУ ХХІ СТ.

***Ключавыя словы:*** этнакультурныя працэсы, гарадская сям'я беларусаў, мадэрнізацыя і урбанізацыя ўкладу жыцця, трансфармацыя каштоўнасцей сям'і і шлюбу, механізм пераемнасці каляндарных традыцый, традыцыі і інавацыі ў сямейна-бытавой абраднасці, традыцыі роднасна-сваяцкіх адносін, традыцыі выхавання і этыкету, мадэрнізаванасць традыцый, сацыяльна-педагагічны і выхаваўчы патэнцыял традыцый, перспектыўныя напрамкі працы з моладззю.

***Мэта даследавання:*** раскрыццё асноўных тэндэнцый дынамікі этнакультурных працэсаў у гарадской сям'і беларусаў у апошняй трэці ХХ – пач. ХХІ ст.

***Метады даследавання:*** гістарыка-параўнальны аналіз, гістарычнай рэканструкцыі, метады палявых даследаванняў, апытанне, стандартызаванае інтэрв'ю, назіранне, анкетаванне (этнасацыялагічнае даследаванне);

***Навуковая навізна даследавання.*** У дысертацыі ўпершыню ў беларускай этналогіі створаны новы тэарэтыка-метадалагічны падыход у даследаванні этнакультурных працэсаў у гарадской сям'і беларусаў у апошн. трэці ХХ – пач. ХХІ ст.; вылучаны асноўныя перыяды дынамікі этнакультурных працэсаў ў апошн. трэці ХХ – пач. ХХІ ст.; ахарактарызаваны стан і тэндэнцыі працякання этнакультурных працэсаў у сям'і і шлюбе, заканамернасці структурна-функцыянальных і тыпалагічных змяненняў у сям'і; выяўлены механізм пераемнасці традыцый каляндарнай абраднасці беларускага народа; вызначаны традыцыі і інавацыі ў структуры сямейна-бытавых абрадаў; паказаны змяненні ў сістэме роднасных і сваяцкіх адносін, у традыцыях выхавання, маралі і этыкета; акрэслены шляхі рэалізацыі сацыяльна-педагагічнага і выхаваўчага патэнцыялу нацыянальных традыцый у адукацыйнай і сацыякультурнай сферы і паказаны іх уплыў на этнакультурную сітуацыю ў сям'і; распрацаваны напрамкі работы з моладдзю па падрыхтоўцы да сямейнага жыцця ў кантэксце задач дзяржаўнай сямейнай палітыкі.

***Рэкамендацыі да выкарыстання.*** Вынікі дысертацыі могуць быць выкарыстаны ў распрацоўцы дзяржаўных праграм па працы з моладдзю, маладымі сем'ямі, у навукова-даследчых праграмах, у адукацыйнай, выхаваўчай, сацыяльнай і ідэалагічнай рабоце.

***Галіна выкарыстання***. Сацыяльная гісторыя, этналогія, этнаграфія, этнасацыялогія, сацыяльная работа, сацыяльная педагогіка, сацыякультурная дзейнасць.

## РЕЗЮМЕ

Калачёва Ирина Ивановна

## ЭТНОКУЛЬТУРНЫЕ ПРОЦЕССЫ В ГОРОДСКОЙ СЕМЬЕ БЕЛОРУСОВ В ПОСЛЕДНЕЙ ТРЕТИ XX – НАЧАЛЕ XXI ВЕКА

***Ключевые слова:*** этнокультурные процессы, городская семья белорусов, модернизация и урбанизация уклада жизни, трансформация ценностей семьи и брака, механизм преемственности календарных традиций, традиции и инновации в семейно-бытовой обрядности, традиции родственных отношений, традиции воспитания и этикета, социально-педагогический и воспитательный потенциал традиций, перспективные направления работы с молодёжью.

***Цель исследования:*** раскрытие основных тенденций динамики этнокультурных процессов в городской семье белорусов в последней трети XX – начале XXI века.

***Методы исследованoccя:*** историко-сравнительный анализ; метод исторической реконструкции; метод полевых исследований; метод опроса; стандартизированное интервью; наблюдение; метод анкетирования (этносоциологическое исследование).

***Научная новизна исследования:*** В диссертации впервые в белорусской этнологии разработан новый теоретико-методологический подход в исследовании динамики этнокультурных процессов в городской семье белорусов в последней трети XX – начале XXI века; выделены основные периоды динамики этнокультурных процессов в последней трети XX – начале XXI века; дана характеристика этнокультурных процессов в связи с изменениями в структуре, функциях, типах семьи; определены условия сохранения преемственности традиций календарной обрядности белорусского народа; выявлены традиции и инновации в структуре семейно-бытовых обрядов; показаны изменения в системе родственных отношений, традициях воспитания, этики и этикета; определены пути реализации социально-педагогического и воспитательного потенциала национальных традиций в образовательной и социокультурной сфере; разработаны перспективные направления работы с молодёжью по формированию отношения к семье и подготовке к семейной жизни в контексте задач государственной семейной политики.

***Рекомендации по использованию.*** Результаты диссертации могут быть использованы в разработке государственных программ по работе с семьей, в проведении научно-исследовательской работы, идеологической, социальной, воспитательной работе.

***Область применения.*** Социальная история, этнология, этнография, этносоциология, социальная работа, социальная педагогика, социокультурная деятельность.

## SUMMARY

Kalachova Irina Ivanovna

### ETHNOCULTURAL PROCESS IN A BELARUSSIAN CITY FAMILY IN THE LAST THIRD OF XX-THE BEGINNING OF XXI CENTURY

***Keywords:*** ethnocultural processes, belarusian city family, modernization and urbanization of the way of life, transformation of family and marriage values, continuity of traditions mechanism, traditions and innovations in family and life ceremonial rites, traditions of family relationships, traditions of upbringing and etiquette, social and pedagogic potential of traditions, perspective areas of working with youth.

***The purpose of the research:*** discovery of the main tendencies and dynamics of the ethnocultural processes in a belarusian city family in the last third of XX – the beginning of XXI century.

***The methods of the research:*** historical, logical and comparative analysis; historic reconstruction; field-work; oral history; survey (interview); poll (ethnosocial research); observation.

***The scientific novelty of the research***. In this dissertation the new theoretical and methodological conception of ethnocultural processes dynamics in a belarusian city family in the last third of XX – the beginning of XXI century is developed; the dialectical contradictions of the development of the ethnocultural processes in a family are discovered and the conditions of their integral dynamic functioning are detected; the continuity of family and ceremonial traditions mechanism is discovered; the traditions and innovations in the structure of family and life rites are defined; the formation of the new type model in the system of the family relationships and the traditions of upbringing and etiquette; the levels of the modernization of a belarusian city family are discovered; the perspective areas of working with youth to form the correct attitude to a family and to preparing to a family life in the context of governmental family policy are developed.

***The recommendations on the use.*** The results of this dissertation can be used for the development of the governmental programs, connected with family matters, for the implementation of scientific works, for ideological, social and educational purposes.

***Field of application.*** Social history, ethnology, ethnography, ethnosociology, social work, social pedagogy, sociocultural activity.

Навуковае выданне

**КАЛАЧОВА Ірына Іванаўна**

**ЭТНАКУЛЬТУРНЫЯ ПРАЦЭСЫ Ў ГАРАДСКОЙ СЯМ'І БЕЛАРУСАЎ У АПОШНЯЙ ТРЭЦІ XX – ПАЧАТКУ XXI СТ.**

Аўтарэферат
дысертацыі на суісканне вучонай ступені
доктара гістарычных навук

па спецыяльнасці 07.00.07 – этнаграфія, этналогія, антрапалогія

Адказны за выпуск Т.М. Мікулік

Падпісана ў друк 16.11.2008.
Фармат $60{\times}84^{1}/_{16}$. Папера афсетная.
Надрукавана на рызографе. Гарнітура Таймс.
Умоўна друк. арк. 2,91. Улік.-выд. арк. 2,27. Наклад 60. Заказ 1297.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт.
ЛВ № 02330/0494349ад 16.03.2009.
Праспект Незалежнасці, 65. 220013, Мінск.